Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактора—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок пашпарэлі пасярод тэксту 1 р. — к.
За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. дарожэй.
Зьмяшчэньне тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. з к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 193 (2381) Чацьвер, 23-га жніўня 1928 г.

Загатоўкі і спажывецкая каапэрацыя.

(*З перадавіцы «Известий»*).

Спажывецкая каапэрацыя займае адну з самых адказных пазіцый у справе хлебазагатовак. Выключнае ідавер'е ўраду і партыі да спажывецкае каапэрацыі патрабуе ад усіх каапэрацыйных працаўнікоў максымальна напружыць сілы і волю, каб выканаць ускладзеныя на іх задачы. Праўленьні ўсіх спажывецкіх саюзаў павінны неадкладна мабілізаваць, паставіць у поўную баявую гатоўнасьць увесь апарат, вьвязаны з хлебазагатоўкамі, і кінуць на дапамогу яму ўсе сілы, якія можна часова зьняць з іншых участкаў працы. Нельга даводзіць да паўтарэньня леташніх памылак— павольнасьці ў разгортваньні працы, няўважлівасьці да яе з боку каапэрацыйнага актыву, слабасьці эканамічных мерапрыёмстваў.

Каапэрацыя хлебазагатоўчых раёнаў павінна, аднак, ведаць, што магчымаасьці забясьпечаньня загатовак таварамі не бязмежны, што патрэбна бясспрэчная спрытнасьць манэўраваньня таварнымі масамі. Нельга будаваць працы на выкарыстаньні выключна дэфіцытных тавараў і спрод іх найбольш ходкіх (сукно, мяккая скура і г. д.), як у леташнюю кампанію, калі пакідаўся без належнае ўвагі рынак дастатковых тавараў, і нават здараліся перабоі ў дастаўцы іх.

Каапэрацыя павінна пільна сачыць за выкананьнем сындыкатамі, трэстамі і іншымі дастаўляючымі арганізацыямі плянаў завозу, пагодженых нарадаў і г. д.

Каапэрацыя павінна таксама зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на ўласны апарат. Заўкі мясцовае каапэрацыі на дастаўку ёй тавараў павінны пагоджвацца з рэальнымі магчымасьцямі загатовак і ня могуць грунтавацца на вузкім імкненьні ўзьняць свой зварот і інш. Нельга толькі кінуць тавары таму ці іншаму каапэратыву на яго затрабаваньне; трэба таксама прасачыць за правільнай рэалізацыяй тавараў.

Часта здараліся выпадкі ўраўніцельнага разьмеркаваньня тавараў і ўзмоцненае дастаўкі ў гарадзкія цэнтры вытворчых раёнаў, пад прыкрыцьцём закупак вясковага жыхарства ў гарадох; перакідка тавараў павінна быць выкарыстана выключна для непасрэднае мэты—стымуляваньня хлебазагатовак.

ЯПОНСКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ Ў БАРЗЕ

Японія меціць захапіць Усх.-Кіт. чыгунку.

ХАРБІН. 21-8. За апошні час замежны японскі друк ужывае ўсе захады, каб стварыць уражаньне, нібыта кітайская варта на Усходня-Кітайскай чыгунцы лядашчая, і што трэба замяніць яе японскім, ці, у крайнім выпадку, міжнародным войскам. Манчжурскія і японскія газэты, а таксама белагвардзейскі друк штодня зьмяшчаюць артыкулы і заметкі, інсэніраваныя ў гэтым сэнсе.

Супярэчлівыя весткі аб падзеях у Барзе.

ПЕКІН, 20-VIII. У той час, як агенцтва Рэйтэра паведамляе, што становішча ў Барзе робіцца больш спакойным, і што чыгуначны рух па Ўсходня-Кітайскай чыгунцы ў гэтым раёне адноўлен,—паведамленьні агенцтва Ніпон Дэмпо заяўляюць, што сувязь між Харбінам і Хайларам усё яшчэ перарвана, што расейскія пагранічныя праводзяць барацьбу з войскам Ван-Фу-Ліна, і што з «вонкавае Манголіі ва ўнутраную Манголію прышла брыгада ў 3 тысячы пікаў, з вінтоўкамі з савецкае Расеі».

Водпуг слоў агенцтва, галоўна-начальствуючы асобнага райёну трох усходніх правінцый Чжан-Хуан-Сян справае атрымаць японскую падмогу, каб прыдушыць рух.

Газэта «Пекін Энд Цянцьзін Таймс» мяркуе, што выступленьне манголаў у Барзе можа тлумачыцца 3-ма прычынамі: гэта або спроба мангольскае моладзі выклікаць пан-мангольскі рух, або ход СССР у адказ на японскі нажым у Мукдэне, або, нарэшце, яно зьяўляецца вынікам падбухторства з боку колаў «зацікаўленых у пытаньні аб адносінах Манчжурыі да Кітаю». Газэта лічыць, што найбольш праўдзіваю прычынаю руху зьяўляецца першая, і што рух зьяўляецца вынікам сыстэматычнага нажыму кітайцаў на мангольскае жыхарства ўнутранае Манголіі.

МАБІЛІЗАЦЫЯ ЯПОНСКАГА ВОЙСКА Ў РАЙЁНЕ БАРГІ.

ШАНХАЙ, 21-8. Афіцыйнае агенцтва нанкінскага ўраду Гошінь паведамляе: «Між хэйлунцьзянскім войскам пад камандаваньнем Ван-Фу-Ліна і мангольскім войскам здарылася вайсковая стычка ў Маньчоўлі. Чжан-Сюэ-Лян паслаў Ван-Фу-Ліну буйную падмогу.

Пад прыкрыцьцем узмацненьня прыгранічнае варты распачата мабілізацыя японскага войска на поўдні Манчжурыі, каб умяшацца ў падзеі і прысвоіць сабе цывільны кантроль над усімі абласьцямі Хэйлунцьзянскае правінцыі, дзе адбываліся гэтыя падзеі.

У Японіі ўведзена кара сьмерцю.

УСЕ РАБОЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАД ПАГРОЗАЮ НЯЧУВАНЫХ ЯШЧЭ РЭСПРЭСІЙ

ШАНХАЙ. Гэтымі днямі ў Японіі надзвычайным імпэратарскім загадам уведзена пакараньне сьмерцю для рэвалюцыянэраў.

«Кожная асоба ці асобы, якія засноўваюць саюз з мэтаю зьмяніць дзяржаўны лад, будуць караца сьмерцю»—так зазначана ў першых радках агалошанага закону аб ахове ладу ў Японіі.

Ціхаакіянскі сэкратарыят прафсаюзаў зазначае ў сваёй адозьве, што закон гэты накіраван ня толькі проці левых прафсаюзаў, левае рабоча-сялянскае партыі, саюзу пралетарскае моладзі і японскае кампартыі, але і проці японскага рабочага руху ў цэлым. Ціхаакіянскі сэкратарыят прафсаюзаў рашуча пратэстуе проці закону аб пакараньні сьмерцю і проці масавых арыштаў. Сэкратарыят заклікае арганізацыі, якія далучаюцца да яго, наладзіць масавыя пратэсты і выкрываць барбарскія мерапрыёмствы японскае кіруючае зграі

Японія застаецца назаўсёды ў Шандуні.

ШАНХАЙ, 21-8. Паведамляюць, што японцы выразна рыхтуюцца прадоўжыць акупацыю Шандуні „на вскі вечныя». Камандуючы японскімі сіламі ў Шандуні атрымаў загад пабудаваць баракі для салдат.

Пабудова баракоў ужо распачата.

Далей агенцтва паведамляе, што бандытаў у акрузе Цьзяо падтрымліваюць японцы, каб мець прычэпку заостаца ў Шандуні

Як яны салідарызаваліся з мілітарыстамі.

БЭРЛІН, 21-8. Выяўлецца, што пры абмеркаваньні пытаньня аб пабудове бронепоезда на супольным пасяджэньні пленуму ЦК сацыял-дэмакратычнае партыі і с.-д. фракцыі рэйхстагу, шмат якія дэпутаты выступілі з горачаю крытыкаю ўчынкаў міністраў-сацыял-дэмакратаў. Гэтыя дэпутаты пераважна толькі што прыехалі з сваіх выбарчых округ, дзе былі непасрэднымі сьведкамі абурэньня рабочых мас.

Паведамляюць, што перад пасяджэньнем адзін з лідэраў сацыял-дэмакратычнае фракцыі рэйхстагу Брэйтшэйд меў гутарку з вайсковым міністрам Грэнерам і абяцаў яму „працягнуць справу аб бронепоезце праз фракцыю". Узамен Грэнер абяцаў Брэйтшэйду некаторыя ўступкі ў пытаньні «рэспубліканізацыі арміі».

Пакуль ня стала вядома аб ухваленай сацыял-дэмакратамі рэзалюцыі, на біржы працы панаваў прыдушаны настрой, які „Берлінер Барзен Кур'ер" тлумачыў «страхам перад унутрана-палітычнымі ўскладненьнямі".

КАМФРАКЦЫЯ ПАТРАБУЕ ДАЧАСНАГА СКЛІКУ РЭЙХСТАГУ.

БЭРЛІН, 21-8. Прэзыдэнт рэйхстагу Лебэ склікае 22 жніўня раду старэйшын рэйхстагу, каб абмеркаваць патрабаваньне камуністычнае фракцыі неадкладна склікаць рэйхстаг у зьвязку з пытаньнем аб пабудове панцырнага крэйсэра.

КАМПАРТЫЯ НА БАРАЦЬБЕ З ПАЛІТЫКАЮ ЎЗБРОЕНЬНЯЎ.

БЭРЛІН, 17-8. У адпаведнасьці з пастановаю ЦК нямецкае кампартыі, камуністычная фракцыя рэйхстагу разаслала арганізацыям, якія жадаюць узяць удзел у барацьбе проці ўзброеньняў, праэкт закону аб забароне пабудовы панцырнікаў і крэйсэраў.

Нафтавая панама ў Румыніі.

ВЕНА, 20-8. Румынская нафтавая афера перайшла ў новую базу. Арыштаваны дэпутаты Толса і Ірымэску, а таксама яшчэ 8 асоб з ліку землеўласьнікаў, банкавых дзячоў і адміністрацыі акругі Тарговішты.

У кіруючых колах лібэральнае партыі ўзьнята кампанія за спыненьне гэтае справы, бо яна надзвычайна няпрыемная для ўраду і пагражае таксама выкрыць і некаторыя ангельскія капіталістычныя колы.

На VI кангрэсе Камінтэрну.

ТЭЗІСЫ АБ КАЛЁНІЯЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ.

Даведзена поўная безпадстаўнасьць і шкоднасьць тэорыі, нібы імпэрыялізм спрыяе індустрыялізацыі калёній.

Трэба адмовіцца ад ілюзіі наконт рэвалюцыйнае ролі нацыянальнае буржуазеі ў калёніях.

Заключнае слова дакладчыкаў.

Прамова тов. Сікандэра.

ІНДЫЯ ЦІКАВІЦЬ АНГЛІЮ ВЫКЛЮЧНА, ЯК РЫНАК.

МАСКВА, 22-8. На ранішнім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну 21-га жніўня выступіў з заключным словам т. Сікандэр. Ён зазначыў, што выступленьні прыхільнікаў тэорыі «раскалёнізаваньня» і індустрыялізацыі Індыі мелі акадэмічны характар, бо выступаўшыя ня ўлічвалі сапраўдных адносін. Між індыйскімі і ангельскімі капіталістамі няма клясавых супярэчнасьцяў, хоць і няма агульнасьці інтарэсаў. Завярэньні розных прамоўцаў, якія супярэчылі гэтаму становішчу, выніклі з механічнага ўжываньня тэорыі марксызму. Ангельскі імпэрыялізм, галоўным чынам, імкнецца захаваць сваё манапалітычнае становішча ў Індыі і выкарыстаць Індыю з аднаго боку, як рынак прамысловае сыравіны і сельска-гаспадарчых прадуктаў, а з другога боку, як рынак збыту прадукцыі ангельскае прамысловасьці.

У канцы прамоўца напамінае, што Макдональд і інш. лідэры 2-го Інтэрнацыяналу крычаць у голас, каб даказаць, што імпэрыялізм зьяўляецца прагрэсыўным фактарам у калёніях; прамоўца заяўляе: проста ня верыцца, што незаторыя хаварышы гаворадь аб індустрыялізацыі Індыі і тым самым цягнуцца ў хвасьце Макдональда і кампаніі.

ПЕРАМАГЧЫ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫЗМ І РЭФАРМІЗМ.

Страхаў у заключным слове сказаў: «Мы павінны падтрымліваць нацыянальна-вызваленчы рух, але адначасна павінны самым рашучым чынам змагацца проці нацыянал-фашызму і нацыянал-рэфармізму. Нацыянал-фашысцкая прырода нацыянальнае буржуазеі мае яскрава выяўлены характар. Мы павінны заваяваць на свой бок дробную буржуазею, але адначасна ўважліва сачыць, каб нашая партыя не падпала пад дробна-буржуазны уплыў.

ЗАЯВА ТАВ. ПЭППЕРА.

Пэппер зрабіў наконт спрэчак аб кантонскім паўстаньні заяву, якую скончыў зазначэньнем на неабходнасьць выкрыць памылкі навакол пытаньня аб кантонскім паўстаньні, каб у будучыне мець магчымасьць арганізоўваць ня проста паўстаньні, а пераможныя паўстаньні.

Прамова тав. Куусінена.

МАСКВА, 22-8. 21-га жніўня кангрэс Камінтэрну заслухаў заключнае слова дакладчыка па калёніяльным пытаньні т. Куусінена.

Асноўная думка тэзісаў,— сказаў т. Куусінен,—гэта неабходнасьць забясьпечыць самастойную ролю пралетарыяту ў калёніяльных рэвалюцыях. Жыраз заготкім азаблівая ўвага была зьвернута на кітайскую рэвалюцыю. Тэзісы адзначаюць, што галоўнаю задачаю камартыі ў калёніях зьяўляецца самастойная палітычная і прафсаюзная арганізацыя пралетарыяту. Папрок т. Лазоўскага, нібы роля пралетарыяту, як гегемона ў калёніяльнай рэвалюцыі зьнікла ў тэзісах, ні на чым не абгрунтаваны. Папрок т. Лазоўскага ў тым, што, на яго думку, пытаньне аб дыктатуры пралетарыяту і сялянства не даволі канкрэтна выкладзена ў тэзісах, таксама нічым не апраўдан.

Закрануўшы пытаньне аб дэкалёнізацыі, ці інакш, аб індустрыялізацыі калёній, дакладчык зазначае, што няправільная сама па сабе тэорыя дэкалёнізацыі баранілася ў свой час у друку шэрагам таварышоў, якія зараз заяўляюць, што яны ніколі не баранілі гэтага пункту гледжаньня. Асноўная думка дакладчыка: сутнасьць калёніяльнае палітыкі імпэрыялізму ў тым, што ён прыпыняе індустрыяльнае развіцьцё калёній, а не—як некаторыя таварышы заяўляюць—дапамагае індустрыялізацыі калёній. Тэорыя дэкалёнізацыі ёсьць імпэрыялістычная мана.

Па пытаньні аб ролі нацыянальнае буржуазеі дакладчык падкрэсьлівае, што абсалютная выразнасьць у разуменьні характару нацыянальнае буржуазеі нам асабліва неабходна, бо небясьпека—іменна ва ўплыве нацыянальнае буржуазеі на масы. Мы не павінны, значыць, распаўсюджваць якія-б ні было ілюзіі наконт рэвалюцыйнае ролі нацыянальнае буржуазеі, а наадварот, бязупынна напамінаць усім, што нацыянальная буржуазея зьяўляецца найбольш небясьпечнаю перашкодаю на нашым шляху, асабліва тады, калі вядомы. Апошнія падзеі паказваюць, што наша меркаваньне было вусім правільным.

Баронячыся супроць наступу Амэрыкі, супроць узмацненьня яе гаспадарчай і палітычнай магутнасьці ў капіталістычным лягеры, Англія і Францыя спрабуюць шляхам адраджэньня Антанты захаваць за сабой пануючую ролю ў Эўропе. Дзеля гэтага яны імкнуцца хоць-бы часова згладзіць тыя супярэчнасьці, якія існуюць у іх паміж сабой, у прыватнасьці на Балканах.

Англа-французкае супольнае выступленьне ў Баўгарыі, гэта—спроба падліць дыпёматычнага масла ў бурнае мора балканскай палітыкі, каб без перашкоды падрыхтаваць удары супроць галоўных ворагаў. Гэтыя галоўныя ворагі: за акіянам—Амэрыка, у Эўропе—Нямеччына і Італія. Бясспрэчна, што адраджэньне Антанты азначае значнае пагоршаньне ўзаемаадносін паміж Англіяй і Францыяй, з аднаго боку, і Нямеччынай і Італіяй, з другога боку. Абвастрэньне ўзаемаадносін паміж Англіяй і Італіяй ужо зьяўляецца фактам, бо выступленьне Англіі ў абарону Югаславіі зьяўляецца простым вызавам па адрасу Італіі, якая лічыць Югаславію сваім заклятым ворагам на Балканах. Але наўрад ці гэта збліжэньне паміж Англіяй і Францыяй будзе на доўгі час. Калі Англія і Францыя зараз ідуць на згоду, дык гэта гаворыць не аб тым, што паміж абедзьвюма дзяржавамі зьнішчаны ўсе супярэчнасьці, а аб тым, што ў гэтых абедзьвюх дзяржаў маецца адзін агульны вораг.

Аб «прыязьні» паміж Англіяй і Францыяй няма чаго і гаварыць. Не дарма зараз, у дні ўтварэньня англа-французкай згоды, над Лёнданам былі праведзены вялікія паветраныя манэўры. Але з якога боку Лёндану перш за ўсё пагражае небясьпека паветранай атакі? Вядома, з боку Францыі, якая мае найбольшы паветраны флёт у Эўропе і знаходзіцца бліжэй усяго да Англіі. Утварыць згоду паміж сабой і адначасна з гэтым узброіцца адзін супроць другога—гэта адна з асноў міжнароднай палітыкі капіталістычных дзяржаў.

В. Т.

БАЛКАНСКІ ПЕРАПЛЁТ.

Нэттуно...

Наўрад ці хто з нашых чытачоў ведаў пра існаваньне гэтага маленькага італьянскага гарадка. Аднак, назва гэтага гарадка зараз увайшла ў міжнародную палітыку нашых дзён.

Яшчэ ў 1925 годзе ў Нэттуно была падпісана згода паміж Італіяй і Югаславіяй. Пад націскам італьянскага імпэрыялізму Югаславія прымушана была пайсьці на ўступкі Італіі і згадзіцца на падпісаньне вельмі нявыгоднага для Югаславіі дагавору. У прыватнасьці, па гэтаму дагавору італьянцы атрымалі асобныя прывілеі ў Харватыі і Далмацыі—у паўночных частках Югаславіі, прыгранічных з Італіяй. Так, напрыклад, дагавор прадугледжваў недатыкальнасьць зямляў абшарнікаў-італьянцаў у Югаславіі: у выпадку правядзеньня зямельнай рэформы ў Югаславіі гэтыя землі не падлягалі адабраньню.

На працягу трох гадоў згода, падпісаная ў Нэттуно, не набывала законнай моцы: югаслаўскі парлямант адцягваў ратыфікацыю (канчатковае зацьверджаньне) гэтай згоды. Супроць згоды выступіла частка палітычных партый Югаславіі, асабліва тыя партыі, якія бароняць інтарэсы буйнай і дробнай буржуазеі ў Харватыі і Далмацыі.

Але барацьба вакол нэттуноўскай згоды была барацьбой ня толькі розных палітычных партый унутры Югаславіі, але набыла вялікае міжнароднае значэньне. Францыя, для якой пашырэньне італьянскага ўплыву на Балканах стварае вялікую небясьпеку, падтрымлівала спробу Югаславіі адмовіцца ад дагавору, закранаючага югаслаўскія інтарэсы. Наадварот, Англія, якая выступала ў апошнія гады ў якасьці саюзьніцы Італіі, усімі спосабамі дамагалася ратыфікацыі нэттуноўскай згоды, жадаючы, такім чынам, супольна з Італіяй нанесьці ўдар французскім інтарэсам.

У апошні час ангельскі націск на Югаславію быў асабліва моцны. Ангельскі ўрад заявіў, што ён дасьць патрэбную Югаславіі пазыку толькі пры ўмове, калі Югаславія зацьверджыць нэттуноўскую згоду. Французкае-ж падтрыманьне Югаславіі пачало аслабіваць. У выніку югаслаўскі парлямант адкуўна зацьвердзіў нэттуноўскую згоду. Пры гэтым на адным з пасяджэньняў парляманту былі забіты правадыры харвацкай партыі—Радзіч і іншыя, асабліва паўстаўшыя супроць нэттуноўскай згоды.

Зацьверджаньне нэттуноўскай згоды супала з другой вельмі важнай палітычнай падзеяй на Балканах. Англія і Францыя прад'явілі супольнае патрабаваньне ўраду зараз-жа ліквідаваць унутраную македонскую рэвалюцыйную арганізацыю.

Што гэта за арганізацыя? Гэта—партызанскі саюз на тэрыторыі Баўгарыі, асноўная задача якога—барацьба за аб'яднаньне Македоніі, вобласьці на Балканах, падзеленай пасьля сусьветнай вайны паміж Югаславіяй, Баўгарыяй і Грэцыяй. Арганізацыя дзейнічае, галоўным чынам, на тэрыторыі югаслаўскай часткі Македоніі і, паколькі дзейнічае супроць югаслаўскай дзяржавы, падтрымліваецца баўгарскім урадам. Македонская арганізацыя мае чыста нацыяналістычны характар. Назваць яе рэвалюцыйнай ніяк немагчыма хоць-бы ўжо толькі таму, што яна ўдзельнічае ў карных экспедыцыях баўгарскіх фашыстаў супроць баўгарскіх рабочых і сялян.

Прад'явіўшы зараз баўгарскаму ўраду патрабаваньне аб неадкладным зьлікідаваньні македонскай арганізацыі, Англія і Францыя адкрыта выступалі ў карысьць Югаславіі.

Але вельмі паказальным зьяўляецца тое, што Англія і Францыя выступілі супольна ў пытаньні, вакол якога яны да гэтага часу ня толькі ня сходзіліся, але, наадварот, змагаліся адзін супроць другога. Чым-жа гэта тлумачыцца?

Падаўна мы паведамлялі аб утварэньні згоды па пытаньні аб марскім узбраеньні між Англіяй і Францыяй. Ужо тады мы зазначалі, што гэта згода значна шырэйшая і датычыцца ня толькі марскога ўзбраеньня, а пакавае сабой адраджэньне старога англа-французкага ваенна-палітычнага саюзу, таго саюзу, які пад паўзабытай ужо зараз назвай «Антанты» вёў ваенную барацьбу супроць Нямеччыны.

Блізіцца эра „вечнага міру".

ПАРЫЖ ПАДРЫХТАВАЎСЯ ДА СПАТКАНЬНЯ «МІРАТВОРЦАЎ».

ЛЁНДАН, 21-8. Водпуг афіцыйных ангельскіх паведамленьняў, у Парыжы скончыліся ўсе падрыхтоўкі да надыходзячага ўрачыстага падпісаньня пакту аб адмове ад вайны. Угавор будзе падпісан у панядзелак.

ЗАЛАТОЕ ПЯРО КЕЛЁГУ.

ПАРЫЖ, 21-8. З Гаўру паведамляюць, што Келёгу будзе перададзена ад імя гораду Гаўру залатое пяро, якім будзе падпісан пакт.

ГУКІ ДЫСАНАНСУ Ў МІРНАЙ СЫМФОНІІ.

ЛЁНДАН, 21-VIII. „Дэйлі Тэлеграф" заяўляе, што ангельскія афіцыйныя колы лічаць незразумелым непакой, выкліканы ў Злучаных Штатах паведамленьнем аб англа-французкім маркім кампрамісе, бо дзяржаўны дэпартамант Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў падрабязна паведамлен наконт умоў англа-французкае згоды. Келёгу былі пасланы яшчэ і дадатковыя растлумачэньні.

«Зараз,—піша газэта,—чарга за Вашынгтонам; яму належыць зрабіць свае заўвагі і паведаміць аб зьменах, якія трэба, на яго думку, зрабіць у чарговых англа-французкіх прапановах».

ФІНЛЯНДЫЯ ТАКСАМА ПРАГНЕ „МІРУ".

ГЕЛЬСІНГФОРС, 21-8. Пададзены фінляндзкім урадам у сойм праэкт бюджэту на 1929 год прадугледжвае павялічэньне выдаткаў на абарону на 48 міліёнаў марак. Бюджэт вайсковага міністэрства складае суму ў 596606000 марак. Такім парадкам, вайсковых выдаткаў прыпадае на 167 марак 67 пэні на кожнага жыхара краю.

Пакт Келёга і СССР.

ВАШЫНГТОН, 21-8. Намесьнік міністра замежных спраў Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў Вільям Кестль заявіў па пытаньні наконт далучэньня СССР да пакту Келёга так: „Савецкі Саюз можа далучыцца да пакту Келёга зараз-жа пасьля падпісаньня яго ў Парыжы, або ў любы час у будучым. Угавор будзе дапаўнены ў Вашынгтоне, куды нарком па замежных справах можа перадаць аб сваім далучэньні праз пасрэдніка".

Нарэшце Кестль дадаў, што далучэньне СССР да пакту Келёга не будзе азначаць прызнаньня СССР Злучанымі Штатамі.

ЛІТВА АДХІЛІЛА ПОЛЬСКІЯ ПРАПАНОВЫ.

ПЕРАМОВЫ ІЗНОЎ АДЦЯГВАЮЦЦА

КОЎНЯ, 21-VIII. Водпуг вестак газэт, літоўскі ўрад у адказе, перададзеным Шумлякоўскаму (начальнік канцэлярыі польскага міністэрства замежных спраў) заяўляе, што лічыць непажаданым склік польска-літоўскае канфэрэнцыі як у Кёнігсбэрзе 22-га жніўня, так і ў Жэневе 25-га жніўня. У адказе вазначана, што ў першым выпадку адсутнасьць Залескага не дало-б магчымасьці ўдзельнічаць і Вальдэмарасу, а ў другім выпадку—перашкодзіць працы канфэрэнцыі сэсія Лігі. Далей у адказе гаворыцца, што наогул у гэты час варункі ў Жэневе былі-б яспрыяючымі для працы канфэрэнцыі.

Водпуг вестак газэты «Эхо», літоўская нота-адказ прапануе, каб абодвы міністры (г. зн. Вальдэмарас і Залескі) спаткаліся ў Жэневе і там умовіліся наконт тэрміну далейшых перамоў.

Адказ Вальдэмараса на прамову Пілсудзкага.

„Газэта Варшавска" (№ 242) паведамляе, што Вальдэмарас выступіць на сапраўдным зьезьдзе ў Уэлнах з прамовай, у якой будзе адказваць на прамову Пілсудзкага, сказаную ім у Вільні.

РАСПАД ЮГАСЛАЎСКАЕ ЎРАДАВАЕ КААЛІЦЫІ.

ВЕНА, 20-8. Як паведамляюць з Белграду, за мінулы тыдзень у Харватыі і Баводзіне шмат новых арганізацый дэмакратычнае і радыкальнае партыі (партыі ўрадавае кааліцыі) далучыліся да дэмакратычна-сялянскае кааліцыі (апазіцыйная). Унутры ўрадавае радыкальнае партыі распачаліся сваркі. Так званая група Пашыча, на чале якое знаходзіцца Нікчыч, патрабуе адстаўкі ўраду Нарашоца і назначэньня «нейтральнага» ўраду, які павінен правесьці новыя выбары ў скупшчыну (парлямант). Група Пашыча матывуе гэтае патрабаваньне неабходнасьцю дасягнуць згоды з загрэбскай апазіцыяй.

БАРАЦЬБА Ў ПАРЛЯМАНЦЕ АБВАСТРАЕЦЦА.

ВЕНА, 21-8. На міжпарляманцкую канфэрэнцыю ў Берліне выехала з Белграду дэлегацыя скупшчыны, якая складаецца выключна з прадстаўнікоў белградзкіх партый. На чале дэлегацыі—дэпутат сэрбскага сялянскага саюзу Іёвановіч.

Выканком дэмакратычна-сялянскае кааліцыі пасылае ў Берлін сваю дэлегацыю з мэтаю інфармаваць замежную грамадзкую думку аб становішчы ў Югаславіі.

Партыя Радзіча праз тэлеграму на імя старшыні рэйхстагу Лебэ заяўляе, што белградзкі парлямант ня мае ніякага права выступаць ад імя Харватыі.

Паўстаньне ў італьянскай калёніі.

РЫМ, 21-8. У італьянскім друку зьмешчана паведамленьне агенцтва Стэфані пра бойкі між італьянскім войскам і паўстанцамі ў Трыпалітаніі. У райёне Джэдэль здарылася стычка між італьянскім атрадам панцырнікаў і паўстанцамі. У выніку бойкі загінула 11 паўстанцаў. Сур'ёзная стычка здарылася таксама ў лесе каля Бір-Гарадулясу.

ЗАБОЙСТВА АГЕНТА МУСАЛІНІ Ў БЭЛЬГІІ.

ПАРЫЖ, 16-8. З Бэльгіі паведамляюць, што ў Льежы на аднэй з людных вуліц забіт агент італьянскае ахранкі Чэстары, на хлусьлівым данесе якога бэльгійская паліцыя нядаўна арыштавала італьянскага адваката Ботыні.

Вестка ад Амундсэна?

Рыскай газэце «Рыгашэ Рундшау» перадаюць з Амстэрдаму, што гэтымі днямі рыбаловы ля галяндзкага ўзьбярэжжа вылавілі бутэльку з пісулькаю, падпісанаю Амундсэнам. У пісульцы дакладна зазначаецца месца, дзе знаходзіцца самалёт «Латам»—а іменна, ля паўночна-ўсходняга пункту Шпіцбэргена.

З прычыны вялічэзнае адлегласьці Галяндыі ад Шпіцбэргену, спачатку гэтай знаходцы не надавалі ніякага значэньня і лічылі яе містыфікацыяй. Цяпер, аднак, нямецкія газэты паведамляюць, што пісулька была паказана нарвэскаму консулу ў Амстэрдаме, які быў уласна знаёмы з Амундсэнам і мае ад яго шмат лістоў. Як заявяюць газэты, консул прызнаў, што знойдзеная пісулька сапраўды напісана рукою Амундсэна, і выказаў упэўненасьць, што яна зьяўляецца сапраўдным паведамленьнем ад видомага палярнага дасьледцы.

„Красін" адплыў на росшукі Амундсэна.

МАСКВА. Водпуг паведамленьня камітэту дапамогі „Італіі", рамонт «Красіна» скончыўся. 22-га жніўня «Красін» выходзіць з Ставангеру. Некаторая затрымка здарылася з тае прычыны, што лёдакол быў пасаваны значна больш сур'ёзьней, чымся меркавалася.

Сорам і жаль да саміх сябе.

ЛЁНДАН, 20-VIII. Лібэральная „Манчэстэр Гардыян" так піша наконт падняцьця падводнае лодкі «L 55».

«Гэтая лодка—жахлівы ўспамін пра адно са здараньняў у нашай гісторыі, ад якога можам адчуваць толькі сорам і жаль. Варта ўспомніць, што жыцьцё 43-х людзей, загінуўшых у патопленай лодцы, ахвяравана ў той час, калі эўрапейская вайна ўжо скончылася, а мы неафіцыйна заявалі з Расеяй».

Далей газэта піша, што ангельская інтэрвэнцыя проці Кастрычнікавае рэвалюцыі азначала ўмешваньне ангельскага ўраду «ва ўнутраныя справы чужога народу, каб паспрабаваць вярнуць урад, які гэты народ скінуў».

ОРГАН ЧЭХАСЛАВАЦКАЕ КАМПАРТЫІ ПАД ПАГРОЗАЮ ЗАЧЫНЕНЬНЯ.

ПРАГА, 19-8. Праскі вярхоўны суд адхіліў апэляцыю выдавецтва камуністычных газэт «Рудэ Право» і «Рудэ Вячэрнік», пададзеную імі на пастанову суду, які прызнаў, што гэтыя газэты парушылі закон аб друку.

Гэтая пастанова вярхоўнага суду, ухваленая з нізвыклаю для звычайнага тэмпу разбору справы хуткасьцю, дае магчымасьць абласному кіраўніцтву Чэхіі спыніць выданьне гэтых газэт у любы момант на час да аднаго месяцу.

ПОСЬПЕХ САВЕЦКАГА ПАВІЛЬЁНУ У КЁЛЬНЕ.

БЭРЛІН. 18-8. Да 15-га жніўня ў савецкі павільён на міжнародная выстаўцы друку ў Кёльне наведалася больш 2-х з паловаю мілёнаў чалавек.

Павільён, як і раней, знаходзіцца ў цэнтры увагі наведваючых выстаўку.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Тугутт аб бліжэйшых пэрспэктывах у Польшчы.

Лідэр „Вызваленьня" Тугутт гэтымі днямі востра ахарактарызаваў апошнія два гады панаваньня сучаснай сыстэмы ў Польшчы і выказаў прыпушчэньне, што паміж урадам і соймам трэба чакаць новых канфліктаў і вынікі гэтых канфліктаў Тугутт ацэньвае пэсымістычна для сойму.

Прысуд над камуністамі.

Лодзінскі суд разглядаў гэтымі днямі справу пяці асоб, абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі. Падсудныя былі арыштаваны ў канцы красавіка г. г. у часе прыгатаваньня да выступленьня ў дзень 1 мая.

Суд прыгаварыў С. Мархавецкага на 3 гады катаржнага вастрогу, С. Савінскага і С. Вэбэ на 2 гады. З. Крынскі і Г. Зыдкэ апраўданы.

Ліпень даў 88 млн. злотых дэфіцыту.

Ліпень, як і папярэднія месяцы, даў Польшчы ў гандлёвым балянсе дэфіцыт.

Паводле аблічэньняў вываз у ліпені ўзняўся 200 млн. злотых, а прывоз 288 млн. зл. Дэфіцыт за ліпень—88 млн. зл.

Камуністычная агітацыя і арышты.

«Кур'ер Варш.» (№ 228) паведамляе, што апошнімі днямі на абшары Люблінскага ваяводзтва можна было заўважыць ажыўленьне дзейнасьці кампартыі. У сувязі з гэтым адміністрацыя зрабіла шэраг арыштаў у паветах: Янаўскім, Біла-райскім, Замойскім і Пулаўскім.

Арышты камуністаў ва Ўлацлаўку.

„Глос Правды" (№ 228) паведамляе, што гэтымі днямі Ўлацлаўская паліцыя накрыла пленарнае пасяджэньне мясцовых камуністаў, арыштавана 7 асоб.

Аб „арганізацыях" Янкі Станкевіча.

Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клюб выдаў камунікат у справе здрадніцкай працы Я. Станкевіча, яго «Гаспадарскага Зьвязу» (газэта) і «Сялянскай партыі», перасьцерагаючы беларускае грамадзянства і працоўныя гушчы ад уступу ў гэтыя арганізацыі.

Забастоўка на Відзеўскай мануфактуры.

На фабрыцы Відзеўскай мануфактуры ў Лодзі выбухнула забастоўка, у якой прымае ўдзел каля тысячы работнікаў.

У Саюзе ССР.

АМЭРЫКАНСКІ СЭНАТАР ТОМАС У МАСКВЕ

ПРЫ СПАТКАНЬНІ З Т. Т. МІКАЯНАМ І ЛІТВІНАВЫМ ТОМАС ЗАЯВІЎ АБ АДСУТНАСЬЦІ Ў АМЭРЫЦЫ ПРАВІЛЬНАЕ ІНФАРМАЦЫІ АБ СССР.—ТОМАС АБЯЦАЕ ЗРАБІЦЬ УСЁ МАГЧЫМАЕ ДЛЯ ХУТЧЭЙШАГА ДАСЯГНЕНЬНЯ ПАРАЗУМЕНЬНЯ МІЖ АБОДВЫМІ КРАЯМІ.

МАСКВА. Сэнатар Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў Томас, які знаходзіцца зараз у Маскве, паведаўся да Наркома Гандлю СССР т. Мікаяна і да намесьніка Народнага Камісара па Замежных справах т. Літвінава.

У гутарцы Томас заявіў, што для Амэрыкі Расея да гэтага часу зьяўляецца загадачным краем. Ніякіх дакладных вестак аб тым, што дзеецца ў СССР, Амэрыка не мае. Амэрыканскія гаспадарчыя і грамадзянскія колы маюць інфармацыю аб СССР звычайна неадпавядаючую сапраўднасьці.

Між іншым, у гутарцы з т. Мікаянам сэнатар Томас зазначыў, што СССР даводзіцца карыстацца для сваёй вытворчасьці амэрыканскаю бавоўнаю. Разьлічваецца за гэтую бавоўну, аднак, даводзіцца пераважна праз Нямеччыну, а гэта, зразумела, невыгодна для абодвых бакоў. Тлумачыцца гэта тым, што Амэрыка дасюль яшчэ не прызнала СССР.

Галоўнымі прычынамі няпрызнаньня СССР Злучанымі Штатамі сэнатар Томас лічыць нявырашанае яшчэ пытаньне аб даўгох і пытаньне аб прапагандзе ў Амэрыцы камуністычных ідэй, у чым там вінаваціць СССР. Такое становішча, на яго думку, зьяўляецца ненармальным і павінна быць упарадкавана. Томас зазначыў, што ён асабіста заўсёды быў настроены ў адносінах да СССР прыхільна і што гэтыя яго адносіны яшчэ ўзмацніліся пасьля прыезду яго да нас.

Томас (ён зьяўляецца сэнатарам Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў і сябром абедзьвюх палат ад дэмакратычнае партыі) абяцае, вярнуўшыся ў Амэрыку, зрабіць усё магчымае, каб азнаёміць Амэрыку з СССР і палепшыць адносіны між гэтымі дзьвюма вялікімі рэспублікамі.

Як Мікаян, так і Літвінаў заявілі сэнатару Томасу, што такія наведваньні, як яго, для СССР вельмі пажаданы, бо даюць магчымасьць амэрыканскім дзеламу людзям бачыць будаўніцтва СССР і знаёміцца з сапраўдным становішчам у нас.

Абсьледваньне рэспубліканскіх наркаматаў.

МАСКВА, 21-8. НК РСІ СССР распачынае 1-га верасьня абсьледаваць парадак прыёму наведваючых і разгляд іх заяў у савецкіх установах. Абсьледаваны будуць органы НК Працы, Наркамзему, НК Сакыяльнае Забясьпекі і Наркамфіну на тэрыторыі РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР, пачынаючы ад сталіц і канчаючы некаторымі з валасьцёў і райёнаў.

Абсьледаваньне мае на мэце наблізіць арганізацыю, час і парадак прыёму да патрэб і выгоды мыхаротва, а таксама правяць адносіны да мыхаротва з боку служачых савецкіх устаноў.

3-ці чарговы пленум ЦКК.

МАСКВА. Трэці чарговы пленум ЦКК УсеКП(б) (складу XV зьезду) адчыняецца 25-га жніўня 1928 г. а поўдні ў Андрэеўскай залі вялікага Крамлёўскага палацу.

Рост хлебазагатовак на Паўночным Каўказе.

РАСТОЎ-ДОН. За апошнюю пяцідзёўку загатоўкі павялічыліся. Загатоўлена 43 тысячы тон, або амаль што на 10 тысяч тон больш, чымся ў мінулую пяцідзёўку. За 19 дзён жніўня загатоўлена 136295 тон, або 46 проц. месячнага плану. З асобных округаў на першым месцы стаіць Кубань, якая выканала больш 100 проц. заданьня. Дажджы перашкаджаюць малацьбе.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ПРАКЛЯМАЦЫІ Ў КАНТОНЕ.

ШАНХАЙ. З Кантону паведамляюць, што гэтымі днямі камуністы, разьяжджаючы па горадзе на 11-ці аўтамабілях, раскідалі праклямацыі з заклікам да рабочых і сялян паўстаць проці ўраду.

У Індыі заснован к-т «Прэч вайну».

ЛЁНДАН, 18-VIII. У Энчадэ (Індыя) заснован камітэт «Прэч вайну». На чале арганізацыі—выдатныя дзеячы партыі свараджыстаў (нацыяналістаў). Камітэт заяўляе ў адозьве, што Індыя не павінна браць удзелу ў будучых войнах. Рэзалюцыя выказвае „поўнае спачуваньне антыімпэрыялістычнай палітыцы Савецкага Саюзу».

ВЫДАНЬНЕ ТВОРАЎ ТАЛСТОГА Ў АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 13-8. З прычыны надыходзячага стагодзьдзя з дню нараджэньня Талстога выдавецтва Аксфордзкага унівэрсытэту выдае вбор твораў Талстога ў 21-м томе.

РЭФАРМІСЦКІЯ СЫНДЫКАТЫ БАРОНЯЦЬ ІНТАРЭСЫ БУРЖУАЗЕІ.

ПАРЫЖ. 18-8. Унітарная канфэдэрацыя працы зьвярнулася з адозваю да ўсіх рабочых, заклікаючы іх змагацца за павялічэньне заработку, за захаваньне і пашырэньне правоў прафсаюзаў.

Адозва кажа, што, не зважаючы на нясупынны рост дарагоўлі, заработак зьменшыўся за апошнія 2 гады на 12-18 проц. Занепакоеныя бадзёрым настроем рабочых мас і вялічэзным ростам забастовачнага руху, рэфармісцкія правадыры высоўваюць лёзунг аб абавязковым арбітражы, спрабуючы, такім парадкам, паставіць пад закон права страйкаў і забастовак.

Вялізныя пажары ў Гамбурзе і Празе-Чэскай.

Гэтымі днямі ў Гамбурзе і Празе выбухлі вялізныя пажары. У Гамбурзе выбух пажар магазынаў фірмы Розэнбэрг-Гольц і фірмы Іардан і Бэргэр. У працягу некалькіх хвілін згарэлі будынкі, у якіх знаходзіліся сотні бутэлак з тлёнам, амоніякам і ацэтыленам, а таксама аграмадныя запасы гаручых матар'ялаў, як, напр. бавоўна. Наступіў выбух, які раскідаў гарашчыя прадметы на стаяўшыя ў порце лодзі з бочкамі алівы і шпіндару, якія таксама запаліліся.

У Празе пажар выбух на таварнай станцыі ў складах нафтавай кампаніі «Дамброва» і ў складах Ойль Кампані. Страты выносяць некальні мілёнаў кронаў.

Тураўскас уцёк.

„Глос Правды" (№ 222) паведамляе, што рэдактар ковенскай газэты «Рытас» Тураўскас, інтэрнаваны за апазіцыйныя да ўраду Вальдэмараса артыкулы, уцёк з канцэнтрацыйнага лягеру ў Ворнях. Дапамагалі яму ўцячы яго палітычныя прыяцелі.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Першымі здалі падатак.

Бабруйск, 22-8. *Зараз-жа па ўручэньні акладных лістоў сяляне пачалі здаваць с.-г. падатак. Першым поўнасьцю падатак здаў селянін пас. Беразоўка, Глускага р.,* **Міцкевіч Сямён**; *за ім сяляне в. Запольле* **Чайка Павал** *і* **Гарох Хама** *здалі палову падатку і сялянка* **Капойка Настуля** *трэцюю частку. Усяго яны здалі 74 р. 40 к.*

Як ідзе кантрактацыя лёну.

Дагавор паміж Белсельсаюзам і крэдытным с-г. таварыствам па кантрактацыі пасеваў лёну ў гэтым годзе выканан на 134,5 проц. Закантрактавала лён на валакно 450 сялянскіх гаспадарак, з іх пайшчыкаў т-ва—247—54,9 проц., беднякоў з агульнага ліку—66 гасп.—14,7 проц., серадняковў 308 гаспадарак—68,4 проц. і заможных—76, або 17,0 проц. Лён на насеньне закантрактавала 131 гаспадарка, з іх пайшчыкаў 84 гасп., ці 64,2 проц.; беднякоў з агульнага ліку 14 гасп.—10,7 проц., серадняковў 91 гаспадарка—69,5 проц. і заможных 26 гасп., ці 19,8 проц.

Колькасьць высеянага насеньня кантрактатарамі ў гэтым годзе 31,6 тоны, а ў мінулым годзе гэтымі-ж гаспадаркамі высеена 20,35 тоны, ці 64,4 проц. З паказанай вышэй колькасьці—31,6 тоны, выдана т-вам сваім пасеўшчыкам сямян лёну 24,9 тоны, з іх лёну даўгунцу 15,28 тоны і не сартавога—9,62 тоны.

Выдана авансаў пасеўшчыкам — 1.677 рублёў.

Злосных невыканаўцаў заключаных дагавораў 3 чалавекі з агульнай непасеянай плошчай 2 гэктары.

ФІЛІПЕНЯ.

Халапенічы, Меншчына.

Рыхтуюцца да спатканьня гідрапляну.

З паловы жніўня пачынае курсіраваць па СССР гідраплян, які мае на ўвазе пабываць і ў Барысаве.

Для сустрэчы гэтага аэрапляну гарадзкім саветам ТДА выдзелена спэцыяльная камісія з прадстаўнікоў розных арганізацый, а таксама тэхнічная камісія для падрыхтоўкі спуску, абароны гідра-аэрапляну ў часе стаянкі яго ў Барысаве.

Спэц. лектарамі аэрапляну будуць праводзіцца лекцыі на ўсіх заводах, прадпрыёмствах.

Гідра-аэраплянам будзе праводзіцца паветранае «крашчэньне», дзеля чаго гарсаветам ТДА разьмеркавана будзе па ячэйках 38 платных палётаў ад 3-х да 5-ці рублёў коштам.

За лепшую пастаноўку працы ў ячэйках і за др. дасягненьні разьмеркована будзе 6 даромных палётаў.

Г. Барысаў. Клібанаў.

Рабочыя абгаварваюць пяцігадовы плян.

Гомель, 22-VIII. На Дабрускай фабрыцы «Герой Труда» жвава абгаварваўся пяцігадовы плян паперовай прамысловасьці. Кожны цэх, абгаварваючы плян, уносіць практычныя прапановы. Па сканчэньні абгаварэньня пляну ў цэхах ён з усімі папраўкамі і дадаткамі будзе абгаварвацца ў другі раз на пленуме фабкому.

2.000 новых членаў ТДА-Авіяхіму

Гомель, 22-VIII. Лік членаў ТДА-Авіяхіму павялічваецца. У працягу «тыдню абароны» ўцягнута новых 2.000 членаў. У сучасны момант ячэйкі ТДА-Авіяхіму зварочваюць максымум увагі на збор сродкаў

Дзеля замацаваньня калгасаў.

Магілеў, 22-8. Правільная арганізацыя капіталаў у калгасе, з абавязковым вылучэньнем досыць значных непадзельных капіталаў, мае вылючна-важнае значэньне.

Вылучэньне з самага пачатку непадзельных капіталаў у значнай ступені гарантуе калектыў ад сяброў, якія залічваюцца ў яго для «спробы» і якія потым будуць усё «аглядвацца назад». З другога боку, пры непадзельных капіталах выхады некаторых сяброў не адбіваюцца так хваравіта на калектыве.

Вось у вёсцы Пупсе (Бялыніцкі раён) беднота, якая з арганізавала на запасным зямфондзе калектыў «Колас», у клопатах аб замацаваньні калгасу з самага пачатку яго арганізацыі, увяла ў статут пункт, па якім з унасімых паёў адлічваецца 25 процантаў у непадзельны капітал і 10 процантаў—у ўступны ўзнос. Пай вызначан у 100 рублёў з кожнага працаздольнага члена.

Поп—спэкулянт.

Нядаўна выкрыта, што поп коханаўскай царквы спэкулюе хлебам. Назьбіраны «калядаю» ўвосень хлеб вясною прадае па 8—10 руб. Як відаць, «бацця» надумаў лепш заняцца гандлёвымі справамі, як якімісьці „высокімі матэрыямі» адурманьваньня мас, бо гэта куды пэўней.

Коханава.

Непарадкі ў Чэчэрскім с.-г. крэдытным таварыстве.

Гомель, 20-8. Нарсуд 10 вучастку ў Чэчэрску, разглядаючы справу Чэчэрскага сельска-гаспадарчага крэдытовага таварыства, выявіў, што ў таварыстве ня ўсё ў парадку.

Старшыня таварыства Мажэйка растраціў 765 руб. Таварыства купляла лес у мясцовага сялянства, якое атрымлівала яго па ільготных цэнах для сваіх патрэб.

Апроч таго, выяўлена, што крэдыты, адпушчаныя для бяднейшага сялянства, разьмяркоўваліся паміж сваімі людзьмі. Вось яны бяднейшыя сяляне: загадчык райміліцыі атрымаў 60 руб., райённы аграном—110 руб., ветэрынарны доктар—80 р. і г. д.

Нарсуд пастанавіў больш поўна выявіць усе злаўчынкі таварыства.

Курсы для перакваліфікацыі беспрацоўных.

Гомель, 22-VIII. Для перакваліфікацыі беспрацоўных у Гомлі адчыняюцца курсы Цэнтральнага Інстытуту Працы на 50 чалавек. Гарсавет аказвае дапамогу і даў памяшканьне патрэбнае для курсаў. Сродкаў на арганізацыю курсаў інспэкцыяй працы ўжо атрыманы. Курсы пачнуць працаваць у кастрычніку месяцы.

Трымаюць у кішэні.

(Рагачэўскі р., Бабруйшчына).

Шэраг цяжкасьцяй прышлося перамагчы кіруючым установам, каб правесьці самаабкладаньне ў той ці іншай вёсцы, але і гэта работа прайшла з посьпехам. Аставалася толькі сабраць грошы на другі тыдзень, але на справе вышла зусім ня тое, грошы сабраны цераз два месяцы пасьля правядзеньня сходаў па самаабкладаньню. Добра было-б, каб сельсаветы сабраўшы грошы, будавалі за іх тое, што парашылі сялянскія сходы, а то старшыня Куганскага с.-савету трымае грошы ў кішэні, а Дварэцкі, Забалацкі і Старасельскі с.-с. здалі грошы, сабраныя за самаабкладаньне, у кааперативы для закупкі тавараў. Ёсьць сельсаветы, якія пры ўзысканьні грошай не завялі ніякіх спраў ні на прыход, ні на расход і г. д.

Цяпер, калі працоўную сілу можна скарыстаць на дабрабыт вёскі, як пачынка мастоў, грэбель і г. д., с.-с. нічога ня робіцца, грошы яшчэ так-сяк страцілі, а працоўную сілу ня выкарысталі. Нагляду над расходваньнем грошай няма ніякага, рэвізійныя камісіі сельсаветаў кажуць—гэта ня наша справа, актыў у гэту працу ня ўцягнут. Райвыканком усе гэтыя недахопы падагуліў і даў канкрэтныя дырэктывы, каб да сенакосу ўся праца па рэалізацыі сродкаў самаабкладаньня была выканана, сабраныя грошы ня трымаць на руках, а здаваць у ашчадную касу і наогул узяцца за правядзеньне ў жыцьцё пастаноў сельскіх сходаў па палепшаньні дабрабыту вёсак.

Я. Крушына.

В. Крушынаўка, Бабруйшчына.

Навошта гэтак робяць.

Аршанскі працкалектыў шаўцоў усе свае вырабы адсылаў у Віцебск, Ленінград, Менск, Маскву, а ЦРК іх выпісвае адтуль для аршанскага спажыўца. Як гэта ня сьмешна, але такая сыстэма разьмеркаваньня прадукцыі яшчэ існуе ў XX стагодзьдзі. А мы кажам пра нейкае патаньненьне тавараў, рэжыме эканоміі і іншых высокіх рэчах. Гэта не датычыцца аршанскага працкалектыву шаўцоў. Ім лепш дагаварыцца з Ленінградам, як з сваім суседам ЦРК. Гэты маленькі прыклад пацьвярджае мудрую народную прыказку: «Чужы хлеб—гасьцінец»... Хай ён будзе чорствы, нясмачны, але затое чужы...

Ворша.

15 тыс. руб. арцелям інвалідаў.

БАБРУЙСК, 22-8. У мэтах узмацненьня працы інвалідных арцеляў акругі адпушчана 15 тысяч руб., з якіх 5 тыс. руб. беззваротна і 10 тыс. руб. у якасьці 3-хгадовага крэдыту.

Калі-ж адрамантуецца школа?

Пры правядзеньні самаабкладаньня значная частка асьветнікаў была задаволена тым, што к пачатку заняткаў школы будуць адрамантаваны і ня прыдзецца больш мерзнуць. Думка—гэта адно, а плянавае будаўніцтва—другое.

Перш, чым прыступіць да рамонту, камгас складае каштарыс у прысутнасьці тэхніка. Вось тут і пачынаецца. Яшчэ ў маі выехалі ў Калодзішчанскую школу і склалі каштарыс на 700 руб., самаабкладаньне-ж праведзена на 140 руб., якія даўно сабраны. Загадчыку сказалі, каб школы не рамантаваў, бо з РВК будзе дадзена датацыя, і тады толькі можна будзе прыступіць да рамонту. Зараз ужо палова жніўня. Датацыі не даюць, бо грошай няма, і школа не рамантуецца.

У в. Сухараве зусім школы ня было і на сродкі ад самаабкладаньня купілі дом за паўтары тысячы ў другой вёсцы. Купілі ў чэрвені і нанялі падрадчыка, які за 300 руб. браўся разабраць і зложыць будынак к пачатку навучальнага году. Але калі патхнуліся ў РВК, то загадчык камгасу сказаў, што 300 руб. дорага. Чакаюць. Пяць раз прыяжджаў старшыня, была і настаўніца і пісалі, але падрадчыка няма, і дом стаіць спакойна на месцы.

На Віцкаўшчынскую школу правялі самаабкладаньне на 400 руб. Грошы пакуль што ляжаць, школы не рамантуюцца, а райённыя працаўнікі, відаць, ня маюць часу прыступіць да справы.

Надыходзіць навучальны год, а школы засталіся ні з чым.

Б.

М-ка Самахвалавічы, Меншчына.

Пара разгарнуць загатоўку хлеба.

(Гутарка з Наркамгандлю БССР тав. Адамайцісам).

На ўсесаюзнай хлебнай нарадзе, якая адбылася ў Маскве, высьветлілася, што збор зернавых культур у цэлым па ўсяму СССР, супроць леташняга году, сёлета будзе вышэй. У бягучым годзе пры некаторым скарачэньні збору жыта мы будзем мець больш збор яравых культур: так, дасьць павялічэньне пшаніца, а таксама крупяныя і кармавыя культуры.

Трэба адзначыць, што геаграфія ўраджаю, а таксама і склад хлябоў па асобных культурах, у параўнаньні з мінулым годам, сёлета атрымалі зьмены: сёлета мы будзем мець скарачэньне збору хлебных культур на Украіне, у Цэнтральнай чарназёмнай вобласьці і спажываючай паласе, але затое мацца вялікае перавышэньне збору ў райёнах сярэдняй і ніжняй Волгі, на Урале, у Казакстане і ў Сібіры. Трэба падкрэсьліць, што асабліва добры ўраджай сёлета мы маем у Сібіры.

Уборка ўраджаю як у БССР, так і па іншых рэспубліках Саюзу значна спазьнілася.

На гэтай нарадзе, побач з разглядам пляну вагатовак па рэспубліках, таксама было разгледжана і пытаньне забясьпечаньня. Для БССР таксама быў выпрацаван плян завозу хлебных прадуктаў на наступны гасп. год арыентыровачна ў 17.500.000 пуд. З гэтай колькасьці будзе завезена з іншых райёнаў СССР—13.000.000 пуд. жыта і пшаніцы, а рэшта прыпадае на іншыя хлебныя культуры і вотрубі і жмыхі. Апрача таго, мацца на ўвазе завезьці да 1000000 пудоў хлебных прадуктаў для прамысловасьці БССР.

Такім чынам, гэты плян завозу хлебных прадуктаў у поўнай меры забясьпечыць усе патрэбы насельніцтва ў хлебных прадуктах і жывёлы ў канцэнтраваных кармох.

Найбольш узмоцнены завоз хлеба сёлета будзе праводзіцца крыху пазьней, прыкладна, у лістападзе-сьнежні, гэта значыць тады, калі ўступіць у хлебазагатоўкі Сібір і Казакстан. Вось чаму ў сучасны момант, а асабліва ў верасьні і кастрычніку, нам трэба будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу на мясцовыя загатоўкі хлеба і ў першую чаргу на атрыманьне хлеба з калектыўных і савецкіх гаспадарак.

З.

2-я пазыка індустрыялізацыі.

ПОСЬПЕХ ПАЗЫКІ Ў ВЁСЦЫ ПРЫ ЎМЕЛЫМ ПАДЫХОДЗЕ ЗАБЯСЬПЕЧАН.

У адзнаку ад пазык буржуазных краін, нашы дзяржаўныя пазыкі маюць ня толькі вузка фінансавае, але і вялікае знанамічнае і палітычнае значэньне. Глыбокае знанамічнае і палітычнае значэньне нашых пазык у тым, што аграмадныя масы працоўных своімі дробнымі зьбереженьнямі робяцца непасрэднымі ўдзельнікамі вялікай справы—сацыялістычнага будаўніцтва краіны.

Новая пазыка зьяўляецца адзінай рабоча-сялянскай пазыкай. Умовы набыцьця пазыкі, усе ільготы адноўкавы для рабочых і сялян.

Усё гэта гаворыць аб вялікім значэньні неабходнасьці разьмяшчэньня пазыкі сярод сялянскай масы. Аб гэтым трэба гаварыць ужо цяпер, бо ў некаторых мясцох нашай рэспублікі ўсе гэтыя моманты ня былі дастаткова падлічаны: усю сваю ўвагу працаўніні накіроўваюць на пралетарскую частку насельніцтва і пакідаюць у баку выключна важны вучастак работы—распаўсюджваньне пазыкі ў вёсцы. Няма ніякіх сумненьняў, што кампанія ў горадзе абядае вельмі добрыя посьпехі і больш лёгкую перамогу, але на трэба забываць аб значэньні распаўсюджваньня пазыкі ў вёсцы.

Больш высокая ўраджайнасьць, некатрае павялічэньне цэн, прадастаўленьне адноўкавых ільгот пры падпіоцы рабочым і сялянам, больш значныя капітальныя затраты на сельскую гаспадарку ў наступным годзе—усё гэта ўтварае спрыяючыя гаспадарчыя і палітычныя абставіны для разьмашчэньня пазыкі сярод сялянства.

Неабходна ўмела скарыстаць гэтыя абставіны—і посьпех пазыкі ў вёсцы будзе забясьпечан.

СЯЛЯНЕ В. ЗАБАШЭВІЧЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА 350 РУБ.

БАРЫСАЎ, 22-8. Сяляне вёскі Забашэвічы добраахвотна падпісаліся на 2 пазыку індустрыялізацыі за адзін дзень на суму 350 руб.

Наш завод даў 35.000 руб.

БАБРУЙСК, 22-8. Рабочыя Бабруйскага чыгунна-ліцейнага заводу вельмі горача адгукнуліся на заклік падпісацца на новую пазыку. Дагэтуль падпіска дала ўжо 35.000 руб.; шмат рабочых падпісалася больш чым на месячны заработак.

Першыя ўзносы па падпісцы.

У Галоўнай Касе Ашчаднасьці шэраг калектываў ужо афармілі сваю падпіску на 2-ю пазыку індустрыялізацыі і зрабілі першыя ўзносы. Так, ужо зрабілі першы ўзнос калектыў мясцкому магазыну ЦРК № 17, арцель «Чырвоны Інвалід», калектыў Чырвонага Крыжу і інш.

Плацяць гатоўкай.

Распачалася ў Менску індывідуальная падпіска. Так, у Галоўнай Касе Ашчаднасьці ўжо прынята падпіска ад некалькіх чалавек, якія поўнасьцю аплацілі гатоўкай падпісаную суму.

Падпісаліся на 100 проц.

Посьпяхова праходзіць падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод служачых групкому № 7 саюзу Медсанпрацы. Першы дзень падпіскі даў 2000 руб. Усе падпісаліся на 100 проц. месячнага акладу. Па думцы групкому, падпіска дасьць добрыя вынікі.

Чыгуначнікі адстаюць.

Падпіска на аблігацыі пазыкі праходзіць з посьпехам. Па папярэдніх даных акрфінадзелу, на 20-е жніўня сума падпіскі была 300.000 руб., што складала 33 проц. заданьня. Ненатоpыя калектывы пачалі афармляць сваю падпіску. Калектывы 7 і 15 арцелі ўнесьлі ўжо першы ўзнос. На лесазводзе «Коллективный Труд» рабочыя падпісаліся на 12.000 руб. Акруговая камісія дапамогі, у мэтах плянавасьці працы, прымацавала калектывы да паасобных контрагентаў, якія праўляюць ініцыятыву. На чыгунцы ў ненатоpых пунктах з прычыны слабой растлумачваючай працы аб значэньні пазыкі, служачыя і рабочыя падпісаліся на 5-10 руб., а ненатоpыя зусім не падпісаліся. Дорпрафсож прапанаваў учыпрафсожам узмоцніць падрыхтоўчую і растлумачваючую працу. Намечаная сума ў 600 тысяч руб. на чыгунцы павінна быць выканана.

За адзін дзень—3000 руб.

Папярэдняя падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод служачых Белхарчтрэсту праходзіць з посьпехам.

За першы дзень падпісалася 34 служачыя на агульную суму 3000 руб.

Ня менш месячнага акладу.

Рабочыя краевецкай арцелі № 7 на агульным сходзе падпісаліся на 750 руб. Усе падпісаліся ня менш як на 100 проц. месячнага акладу.

Будаўнікі не адстаюць.

ВІЦЕБСК, 22-8. На будаўніцтве новага камунальнага дому працуе 80 рабочых, з якіх 50 чалавек падпісаліся ўжо на 3325 руб. Рабочыя падпісваюцца больш чым на 100 проц. свайго месячнага заработку.

Не адстануць і зараз.

ВІЦЕБСК, 21-8. Рабочыя фанэрнага заводу ішлі ў першых шэрагах па рэалізацыі 1-ай пазыкі індустрыялізацыі.

— Мы не адстанем і зараз,—гаворацць рабочыя заводу. За некальні хвілін 28 рабочых падпісаліся на пазыку на 2000 руб. Падпіска працягваецца.

Ажыцьцяўляем пастановы сходаў.

ПОЛАЦАК, 21-8. Кампанія на падпіскі на 2-ую пазыку індустрыялізацыі ў акрузе разгортваецца. Так, калектыў працаўнікоў акрсельсаюзу падпісаўся на 2660 руб., поўнасьцю на месячны заработак. Агульны сход чыгуначнікаў ст. Грамы пастанавіў падпісацца ўсім на месячны заработак. Агульны сход саюзу харчавікоў вынес такую-ж пастанову, і яна ўжо праводзіцца ў жыцьцё.

Заданьне выканаем.

СЛУЦАК. 22-8. Падпіска ў горадзе на 2-ю пазыку гаротвацца. Працаўнікі мясцовага агенцтва Дзяржбанку падпісаліся на 1120 руб. Такія-ж зьвесткі паступаюць і з іншых калектываў. Сваё заданьне Слуцак выканае.

Дзе яшчэ сьпяць.

СЬВІСЛАЧ, 22-8. У нашым райёне пачалася падпіска на пазыку. Рабочыя заводу «Спартак» падпісаліся на 1000 руб., 6 працаўнікоў саюзу савгандзлужачых падпісаліся на 370 руб.

Сьпяць яшчэ на заводзе «Кастрычнік» і чыгуначнікі.

Хто лепшы?

МАГІЛЕЎ, 22-8. Акруговая камісія садзейнічаньня праводзіць конкурс з прэміраваньнем на лепшы ў справе распаўсюджваньня пазыкі сельсавет, на лепшую камісію садзейнічаньня і на лепшыя распаўсюджвальнікі ў мясцовай акруговай газэце аб пазыцы.

ВАЕННАЯ ПАДРЫХТОЎКА НАШЫХ ЗАХОДНІХ СУСЕДЗЯЎ.

Тав. Бэлла ў сваім дакладзе на VI кангрэсе Камінтэрну аб мерах барацьбы з небясьпекаю імпэрыялістычных войнаў шмат увагі зьвярнуў на пытаньне аб ваеннай падрыхтоўцы заходніх суседзяў СССР і іх ролі, як узброенага авангарду ў вайне капіталістычнага сьвету з пралетарскай дзяржавай. Таму з асаблівай увагай мы павінны сачыць за падрыхтоўкай і кансалідацыяй іх узброеных сіл, асабліва зараз, калі над нашымі заходнімі межамі паўстае здань новай вайны.

Праз усе 10 год існаваньня савецкай дзяржавы Англія была галоўнай сілай, якая штурхала і будзіла ўсе капіталістычныя дзяржавы да разгрому Саветаў. Гэтая дзейнасьць Англіі асабліва ўзмацнілася пасьля таго, як два гады таму назад Англія парвала зносіны з СССР. Па думцы ангельскіх кансэрватараў, непасрэдныя суседзі СССР павінны служыць сілай для ажыцьцяўленьня інтэрвэнцыі і ў гэтым сэнсе асаблівыя надзеі ўскладаюцца на нашых заходніх суседзяў. У апошнія гады асабліва ўзмацніліся ўпартыя імкненьні ангельскіх кансэрватараў распаўсюдзіць свой уплыў на сумежныя з намі краіны.

Больш трох год ангельская буржуазея працуе над стварэньнем адзінага ваеннага блёку ўсіх заходніх нашых суседзяў—ад Паўночнага Ледавітага акіяну да Чорнага мора. У гэты блёк павінны ўвайсьці Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Літва, Польшча і Румынія, прычым галоўную кіруючую ролю павінна адыгрываць Польшча, як найбольш моцная рэакцыйная дзяржава са ўсіх нашых заходніх судседзяў. Ня гледзячы на шмат сіл і працы, праробленай у напрамку ажыцьцяўленьня гэтых плянаў, ангельскай дыпляматыі ўсё-ж не ўдалося стварыць гэты блёк. Аднак, палітыка стварэньня супроцьсавецкага блёку з прыгранічных краін усё-ж мае некаторыя посьпехі. Тав. Бэлла ў сваім дакладзе пералічвае наступныя дагаворы, якія ўтвораны паміж асобнымі буржуазнымі дзяржавамі і якія сваім вастрыём накіраваны супроць Савецкага Саюзу:

1) ангельска-польская ваенная канвэнцыя, якая дапаўняе саюзны дагавор 1925 году;

2) польска-румынскі саюзны дагавор і ваенная канвэнцыя;

3) франка-румынскі саюзны дагавор і ваенная канвэнцыя і

4) італа-румынская згода аб «хаўрусе», якая напоўнена тайнай згодай аб аказаньні Італіяй ваенна-палітычнай дапамогі Румыніі.

Шэраг артыкулаў у буржуазнай прэсе запэўняюць нас у тым, што паміж генэральнымі штабамі нашых суседзяў (за выключэньнем Літвы) існуе ўзаемны кантакт, і што імі распрацаваны пляны вайны з СССР. Лепш усяго аб гэтым сьведчыць факт частага ўзаемнага наведваньня вышэйшымі чынамі афіцэрскага корпусу гэтых краін.

Асновай усёй падрыхтоўкі вайны зьяўляецца праэктуемы г. зв. „балтыцкі саюз». Буйнай перашкодай да стварэньня гэтага саюзу зьяўляюцца спрэчкі паміж Польшчай і Літвой у Віленскім пытаньні. Да гэтага часу Літва не адмовілася і ня зьбіраецца адмовіцца ад сваіх дамаганьняў Вільні. Літва ня хоча ісьці ні на якія згоды і перагаворы з Польшчай пакуль ёй ня будзе зьвернута Вільня.

Ужо не гаворачы аб тым, што гэты канфлікт вельмі абвастрае ўсё палітычнае становішча ва Ўсходняй Эўропе, ён перашкаджае ўтварэньню якіх-небудзь грунтоўных дагавораў паміж усімі балтыцкімі дзяржавамі, накіраваных супроць СССР. Як вядома, Англія імкнецца сваім аўтарытэтам зьнішчыць гэты канфлікт, але да гэтага часу ніякіх посьпехаў у даным пытаньні няма. Ліга Нацый прымусіла Літву згадзіцца на перагаворы з Польшчай па аднаўленьню нармальных узаемаадносін. Пасьля ліквідацыі гэтага канфлікту магчымасьць стварэньня балтыцкага саюзу была-б значна набліжана. Але пакуль што ніякіх пэрспэктыў на ліквідацыю канфлікту няма.

Значнай перашкодай да стварэньня саюзу зьяўляецца таксама і тое, што некаторыя колы Фінляндыі і Латвіі таксама бачаць у факце стварэньня саюзу, на чале якога стане Польшча, пагрозу для свайго самастойнага існаваньня. Частка фінляндзкай буржуазеі лічыць, што Фінляндыя знаходзіцца ў баку ад шляхоў, якія злучаюць СССР з вялікімі заходнімі дзяржавамі, і таму ніякай небясьпекі з боку СССР Фінляндыі не пагражае. Вось чаму яна знаходзіць, што Фінляндыі лепш усяго застацца нэйтральнай. Некаторыя колы латвійскай буржуазеі ня хочуць ваеннага саюзу з Польшчай таму, што польскія імпэрыялісты жадаюць узяць у свае канцэсіі і тэрыторыю сучаснай Латвіі, напрыклад, гор. Дзьвінск, Латгалію і нават г. Лібаву.

Часам у прэсе нашых суседзяў сустракаюцца зусім шчырыя заявы аб тым, што ў выпадку ўзброенай сутычкі паміж капіталістычным сьветам і СССР лімітрофам першым прыдзецца ўзяць на сябе ролю выканаўцы ваеннага паходу супроць Саюзу. Знаходзяцца сярод іх і такія шчырыя людзі, якія як узнагароду за «гарматнае мяса», якое яны дадуць у распараджэньне сусьветнай буржуазеі, патрабуюць ад Лігі Нацый неабходнага грашовага падтрыманьня для лепшай падрыхтоўкі да сваёй ролі—ролі прыдушальніка пралетарскай дзя

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Школа і настаўніцтва павінны прыняць удзел у рэалізацыі пазыкі.

Наша савецкая школа павінна ня толькі вучыць дзяцей грамаце, але і выхоўваць будаўнікоў новага сацыялістычнага ладу пасільным сапраўдным удзелам у гэтым будаўніцтве. Вучыць будаўніцтву сацыялізму, ня толькі словамі, а (галоўным чынам) жывой справай, прымаючы ўдзел у вырашэньні жыцьцёвых задач. Такі ўдзел школы ў вырашэньні практычных задач сацыялістычнага будаўніцтва мае вялікае выхаваўчае значэньне для нашай вучнёўскай моладзі, для наўкольнага насельніцтва з аднаго боку і непасрэдны эфэкт выкананай працы—з другога.

Зараз праводзіцца падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі. На настаўніцтва і асабліва вясковае выпадае вялікая і адказная задача па растлумачэньню насельніцтву неабходнасьці, важнасьці і значэньня для кожнага грамадзяніна падпіска на пазыку. Практыка паказвае, што насельніцтва вёскі (ды нават і гораду) яшчэ ня зусім уяўляе сабе карысьці і неабходнасьці дзяржаўных пазык. Настаўнікі ў гэтым напрамку змогуць прынесьці шмат карысьці, праводзячы тлумачэньні ў паасобных гутарках, на сходах сялян і г. д. Ініцыятыва і прыклад самога настаўніка будуць асабліва паказальны.

Вось чаму само настаўніцтва павінна падпісацца на заём у першую чаргу.

Школы ў парадку правядзеньня грамадзка-карыснай працы павінны ўзяць на сябе ініцыятыву па правядзеньню сходаў, дзе абавязкова ставіць пытаньні падпіскі на пазыку. 1—15 верасьня школы ўжо пачнуць заняткі. Вучням неабходна будзе таксама добра растлумачыць сутнасьць, значэньне і тэхніку правядзеньня падпіскі. Магчыма, што некаторыя школы самі калектыўна падпішуцца на 2-ю пазыку індустрыялізацыі.

Праз вучняў неабходна папулярызаваць падпіску сярод іх бацькоў. Школы павінны загатовіць адпаведныя лёзунгі, плякаты, якія павінны папасьці і ў сялянскія хаты. У школьных насьценных газэтах асабліва ўвага павінна быць зьвернута папулярызацыі пазыкі. Газэты павінны адзначыць найбольш актыўных сялян і вучняў у справе падпіскі. У школах неабходна вывешваць сьпіс сялян, якія падпісаліся на пазыку.

Наогул, школы і настаўніцтва павінны выявіць максымум увагі пашырэньню падпіскі сярод працоўных мас гораду і вёскі, памятаючы, што гэтым самым яны выконваюць сваю задачу ў справе будаўніцтва сацыялізму.

В. Самцэвіч.

Да лепшых вынікаў.

Адным з галоўных пунктаў працы ў сёлетнім навучальным годзе павінна быць правядзеньне ў жыцьцё ўсеагульнага абавязковага навучаньня. Практыка мінулага году паказала, што ўсеагульнае абавязковае навучаньне ў вызначаных пунктах не ірвалося на 100 процантаў.

Папершае, таму, што дзеці (пераважна беднаты) несваечасова зьяўляюцца ў школу і рана пакідаюць яе; падругое—камісіі пры сельсаветах па правядзеньню ўсеагульнага абавязковага навучаньня аказаліся зусім непадрыхтаванымі.

Камісіі пры сельсаветах не сачылі за выкананьнем пастановы аб правядзеньні ўсеагульнага навучаньня, а таксама не клапаціліся аб сродках дзеля дапамогі бяднейшым вучням. Прычына такой нерацыянальнасьці камісій—слабае інструктаваньне працы апошніх як з боку інспэктуры, так і вышэйшых органаў улады.

Каб выправіць гэтыя хібы ў надыходзячым навучальным годзе і выканаць пастанову аб абавязковым усеагульным навучаньні, неабходна, папершае, месяц поўны вучот дзяцей, падлягаючых навучаньню, а падругое, сабраць нараду старшынь камісій пры с.-с. і праінструктаваць іх аб працы, усклаўшы на іх поўную адказнасьць за невыкананьне пастановы.

Навучальны год набліжаецца, а ніхто аб гэтым ня думае. Калі ня будзе сталай падрыхтоўкі да гэтай справы, дык могуць паўтарыцца вынікі мінулага году. Побач з гэтым неабходна як найвастрэй паставіць пытаньне за нармальны навучальны год, за своечасовае зьяўленьне вучняў у школу.

Настаўнік П. Клёнік.

Самахвалавічы.

Інспэктар з машыністкай.

Позны час. У ДРЫБІНСКІМ РАЙВЫКАНКОМЕ (Аршанскай акругі) людзей паменшала. Працаўнікі складваюць паперы, каб пайсьці адначасьць. Працуе толькі машыністка. Каля яе райінспэктар асьветы Калінсўскі, які нядаўна прыехаў на Дрыбіншчыну. Ён заўсёды гаворыць на расейскай мове. Вышаў са сваёй песнай каморкі і старшыня РВК і, паморшчыўшы твар, доўга глядзеў, як машыністка, выбіваючыся з сіл, перакладала з расейскай мовы на беларускую паперы і дыктоўку райінспэктара асьветы.

Ну, а што-ж будзе, калі машыністка захварэе, ці адмовіцца перакладаць паперы інспэктара асьветы, як ужо адмовілася дзеладовка (за што і дапталося ёй: «Ты звольнена»). А калі паперы інспэктара асьветы на расейскай мове войдуць у вясковую школу? А як будзе, калі ды сам інспэктар асьветы зьявіцца з расейскаю мовою ў вясковую школу ды пачне гутарыць з вясковымі дзецьмі?..

Ці ня будзе тады ён вазіць з сабою машыністку?

НАСТАЎНІК ВАКНО 3-ПАД ДРЫБІНА.

Настаўнік-бліжэй да насельніцтва

Праз парог глядзіць новы навучальны год. 15 верасьня вясковая дзетвара павінна бегчы ў школы. Як паказалі мінулыя гады, нешта неахвотна дзеці ідуць у школу ў гэты тэрмін. Ня гледзячы на растлумачальную працу настаўнікаў, бацькі затрымліваюць дзяцей школьнікаў дома, пакуль ня скончацца палявыя работы. І вучні замест 15 верасьня пачынаюць прыходзіць у школу 15 кастрычніка, прапусьціўшы месяц. А ў дадатак зімой яшчэ прапусьцяць значны лік працоўных дзён па розных прычынах, а то зусім бязпрычын. І ў выніку школа набывае вялікі процант неўспяваючых вучняў, якія застаюцца ў той самай групе на некалькі год.

На гэта балючае зьявішча ў школе павінен зьвярнуць больш увагі сам настаўнік. Асабліва ў гэтым годзе настаўнік павінен да пачатку навучальнага году пачаць растлумачальную працу, бо палявыя работы, дзякуючы кліматычным умовам, зацягнуцца, і школа ў тэрмін дзяцей не зьбяра. Для больш рацыянальнай, сталай працы настаўніка я раю: настаўніку патрэбна ўвесь год, апрача афіцыйнага адпачынку, знаходзіцца на месцы службы. Тады ён сумее і будзе весьці належную і неабходную грамадзкую працу. А то зімой—яму часу няма, гэта вядома; а ўлетку ён у школе не знаходзіцца. Ад гэтага падчас і аўтарытэт настаўніка сярод насельніцтва, нават і дзяцей, падае.

Трэба падыходзіць бліжэй да насельніцтва, бліжэй да дзяцей.

Магілеўшчына. **Тэфс.**

Дайце апал своечасова.

Нашы вясковыя школы часта застаюцца без апалу, ня гледзячы на тое, што знаходзяцца сярод лясоў.

Дровы адпускаюцца школам несваечасова, вызначаецца лікам дрэ ў,а не кубатураю і ў выніку недахоп вызначанай нормы.

У бягучым годзе бураю паламана шмат лесу. Ня шкодзіла-б, каб нашы райвыканкомы дагаварыліся цяпер в лясьніцтвамі аб водпуску апалу для школ у крэдыт, бо грошай у райвыканкоме ў сучасны момант няма, а калі і будуць, дык не раней лютага месяца 1929 году.

Трэба памятаць, што ад апалу шмат залежаць посьпехі школ у навучаньні.

Дубок.

Настаўнікаў водзяць за нос

Ужо канчаецца жнівень, а наст-ва Койданаўскага райёну яшчэ не атрымала пэнсіі за ліпень і калі атрымае—невядома. Як месяц чаму назад яму ў фінчасьці казалі «даведайцеся на нядзелі, чакаем грошы з Менску», так і цяпер кажуць.

І даведваецца бедны настаўнік праз тыдзень-два ў РВК, залязае ў доўг на вуны, а яго часамі парадуюць трыма-пяцю рублямі, а рэшта—«па нядзелі».

Дамагаемся ад належных органаў хутчэйшага расьсьледваньня гэтай справы, бо трывае гэтак далей немагчыма, тым больш што гэта не агульнае зьявішча на Беларусі: суседні Вузьдзенскі райён заўтра ўжо за жнівень атрымае. Толькі, мабыць, Койданаўскі райён такі нешчасьлівы, што і кватэрных няма, і пэнсіі няма—жыві, як ведаеш і працуй.

Васковы настаўнік.

Школьным бібліятэкарам павінен быць пэдагог.

Значэньне бібліятэк пры школах для падрастаючае вучнёўскае моладзі надзвычайна вялікае. Чытаньне кніжак павялічвае веды вучняў, прывучае іх да карыстаньня кнігай, выклікае эмоцыі і наогул мае вялікае выхаваўчае значэньне. Вядома, што часьці чытаньне кніг аказвае большы ўплыў, чым самая праца ў школе. Адсюль выцякае і неабходнасьць абавязковага забясьпечаньня школ бібліятэкамі з падборам кніг для вучнёўскага ўзросту.

Але гэтага мала. Мала толькі мець бібліятэкі. Трэба, каб загадчык бібліятэкі ведаў інтарэсы вучняў, іх разьвіцьцё, нахіл кожнага вучня, яго ўменьне чытаць і разьбірацца; трэба ведаць тыя кожнага чытача. Бібліятэкар павінен кіраваць чытаньнем, даваць яму належны напрамак, павінен кожнаму вучню даць належныя ўказаньні, тлумачэньні. Адным словам, праца бібліятэкара надзвычайна сур'ёзная і адказная ў агульнай сыстэме вучэбна-выхаваўчае працы школы. Значыць, бібліятэкар павінен быць і пэдагогам.

А ў сапраўднасьці бывае зусім ня так у пераважнай большасьці сямігодак. Там бібліятэкар толькі ведае ды прымае ад вучняў кнігі. І ўсё. Бібліятэкар ня ведае вучняў, іх разьвіцьця, запатрабаваньняў; ня цікавіцца—як прачытана кніга і якое ўражаньне яна пакінула ў вучня.

Тлумачыцца гэта тым, што праца бібліятэкара аплачваецца вельмі слаба і бывае часта дагрузкай дзеладоду. Але справа тут ня ў тым, хто будзе ведаць бібліятэкамі, а справа ў належнай пастаноўцы працы. А каб была належная праца, неабходна яе і аплачваць належным чынам.

Праца бібліятэк павінна быць сыстэматычнай. Мэтрады павінны больш цікавіцца пастаноўкай працы ў нашых бібліятэках. Трэба наладжваць спэцыяльныя абгаварэньні з вучнямі прачытаных імі кніг, рабіць разборы кніг. Трэба выяўляць, як самі вучні ацэньваюць тыя ці іншыя кнігі. Каля бібліятэкі трэба разгарнуць належную працу,—дадаў райінспэктар.

Вы думаеце, што Гапонавіцкую дзетвару інспэктар-пэдагог пазнаёміў з вучнямі Крупскай школы?

Мыляецеся: нашых гапаноўцаў на-

„КАЛЁКВІУМЫ" ПАД ЗАМКОМ.

У адзін з вясенніх дзён вучні-выпускнікі Гапонавіцкай школы (Аршанская акруга) з клункамі за плячамі і на чаце са сваім настаўнікам накіраваліся ў мястэчка Крупкі на калёквіумы.

У гэты-ж самы дзень у Крупскай чатырохкамплектнай школе адбываліся калёквіумы для адной з яе школьных груп. Гапонавіцкая дзетвара, палахліва азіраючыся, падышла к будынку школы і разьмясьцілася на дварэ.

— Калі ласка, запрасеце вучняў у клясу, зараз дадзімо ім пісьмовую працу,—дадаў райінспэктар.

Вы думаеце, што Гапонавіцкую дзетвару інспэктар-пэдагог пазнаёміў з вучнямі Крупскай школы?

Мыляецеся: нашых гапаноўцаў нават не пасадзілі разам з крупскай дзетварой, а пасадзілі ў асобную клясу, далі пісьмовую працу і... замкнулі на ключ...

— Гэтак яно спакойней будзе,—відаць, разважаў райённы інспэктар нарасьветы т. Цітавец.

Ездак гапонавіцкі настаўнік пачаў было спрачацца, што замыканьне дзяцей—ня ёсьць мэтад савецкай школы, што наогул дзеці перапалоханы калёквіумамі, а тут яшчэ адных іх замкнулі ў клясе...

Начальства зірнула коса, і настаўнік змоўк.

Як гапонавіцкія дзеці ў працягу некалькіх гадзін перамагалі свае прыродныя патрэбы, мы сказаць не бяромся, а толькі, відаць, умоўным стукам паведамілі начальства, што пісьмовая праца імі выканана...

Пяць хвілін перапынку, і пачаліся «вусныя калёквіумы»...

Кажуць, кожны з сяброў камісіі проста закідваў пытаньнямі запалоханых дзяцей.

На дзяцей нагналі столькі страху, што ў выніках...

У выніках, зразумела, настаўнік Гапонавіцкай школы зусім кепскі працаўнік і яго маюць на ўвазе зьняць з працы.

Праўда, гэты настаўнік, адчуваючы небясьпеку, сам ужо паехаў працаваць у школу адной з суседніх рэспублік.

В. Зайцаў.

Як часам выяўляюць актыўнасьць

ВЁСКА ПЛЕБАНЦЫ, САМАХВАЛАВІЦКАГА РАЙЁНУ, МЕНСКАЕ АКРУГІ, налічае 112 дзяцей школьнага ўзросту, а ў школе навучаецца ўсяго 53, рэшта дзяцей (59) ня мае магчымасьці зьмясьціцца ў школе.

Ня гледзячы на гэта, настаўніца Мазурчэвіч дзеля пашаны сябе пакінула іншымі сваімі сябрамі рабіла фікцыю ў паказчэньні лічбы скончыўшых вучняў у сваёй школе. Дзеля гэтае мэты яна затрымлівала вучняў апошніх клясы на некалькі год, і яны па некалькі разоў трымалі выпускныя іспыты і атрымлівалі па некалькі пасьведчаньняў. Напрыклад, вучань Багданчык Міхась Ігнатаў атрымаў пасьведчаньне аб скончэньні школы ў 1925 г. за № 1166 і ён-жа ў 1926 г. таксама атрымаў пасьведчаньне за № 164. Такое штучнае затрыманьне вучняў у школе дрэнна адбіваецца на тых 59 вучнях, якія ня маюць магчымасьці хадзіць у школу з прычыны браку месца ў школе.

Такім злачынствам у школе не павінна быць месца.

ТОНЯ.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

18 жніўня г. г. пад старшынствам т. А. І. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне прэзыдыуму ЦВК. Разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ ВЫНІКАХ ПАСЯЎНОЕ КАМПАНІІ

Зацьверджана пастанова па дакладу Наркамзэмляробства аб выніках вясеньняй пасяўной кампаніі.

У гэтай пастанове прэзыдыум ЦВК адзначае, што дырэктывы ўраду ў справе разьвіцьця сельскай гаспадаркі, дзякуючы значнаму ўкладаньню сродкаў з боку дзяржавы і наданьні кампаніі шырокай грамадзкасьці, выкананы.

Пры правядзеньні кампаніі, аднак, мелі месца таксама і некаторыя перашкоды і недахопы (недахоп на месцах здольных практыкаў-арганізатараў па калгаснаму будаўніцтву, неналаджанасьць сыстэмы ў справе кантрактацыі, несваечасовае нападаньне крэдытаў іх трымацелю, няпоўнае выцясьненьне прымітыўных сельска-гаспадарчых прыладаў, а таксама няпоўнае скарыстаньне ўсіх магчымасьцяй у напрамку каапэраваньня сялянства ў форме калектыўнага набыцьця больш складаных сельска - гаспадарчых машын).

У адпаведнасьці з маючымися вынікамі, прэзыдыум ЦВК пастанавіў: распачаць падрыхтоўку да правядзеньня вясеньняй пасяўной кампаніі 1929 г. больш своечасова, уцягваючы ў гэтую справу больш шырокія колы савецкае грамадзкасьці, бядняцкае і серадняцкае сялянства; забясьпечыць замацаваньне арганізаваных калектыўных гаспадарак праз палепшаньне кіраўніцтва і своечасовую матар'яльную дапамогу; перагледзець праграму сельска-гаспадарчых навучальных устаноў, прыстасоўваючы яе для мэт калгаснага будаўніцтва; даручыць Наркамзэмляробства і с.-г. каапэрацыі пашырыць унядрэньне ў вёску сельска-гаспадарчых машын; прапанаваць Наркамзэмляробства і Белсельбанку своечасова забясьпечыць насельніцтва насеньнем і ўгнасьнем у надыходзячую асеньнюю пасяўную кампанію гэтага году; даручыць Наркамзэмляробства выдаць тэхнічную літаратуру па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі—на беларускай, яўрэйскай, польскай і інш. мовах.

АБ САДЗЕЙНІЧАНЬНІ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ГАЗЭТАМ У ВЫКРЫЦЬЦІ ФАКТАЎ ЗЛАЧЫНСТВА І БЮРАКРАТЫЗМУ Ў САВЕЦКІХ ОРГАНАХ.

Прэзыдыум ЦВК, у мэтах палепшаньня абслугоўваньня савецкімі органамі зьвяртаючыхся да іх асоб з розьнымі просьбамі і хадайнічаньнямі, а таксама ў мэтах паглыбленьня працы Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК, пастанавіў:

а) Даручыць загадчыку Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК БССР устанавіць сыстэматычны нагляд і праверку фактаў па артыкулах і заметках у цэнтральных газэтах БССР і СССР аб злачынствах, валакіце і бюракратызму з боку савецкіх органаў і паасобных працаўнікоў пры вырашэньні імі спраў наведвальнікаў.

б) Прапанаваць Пракурору Рэспублікі і акруговым Выканаўчым Камітэтам зрабіць загады падпарадкаваным ім органам рабіць расьсьледваньні і даваць тлумачэньні на даручэньнях Прыёмнай ЦВК па газэтных заметках у тэрміновым парадку.

в) Прасіць рэдакцыі цэнтральных газэт БССР накіроўваць у Прыёмную ЦВК для прыняцьця належных мер заметкі і артыкулы, якія ня могуць быць зьмешчаны на той ці іншай прычыне на старонках газэт.

Загадчыку Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК даручана дагаварыцца з Пракурорам Рэспублікі і НК РСІ адносна парадку далейшага накіраваньня матар'ялаў, дабытых па газэтных заметках.

АБ НАДБАЎКАХ ДА ЗАРПЛАТЫ РАБОТНІКАМ МІЛІЦЫІ ЗА ВЫСЛУГУ ГАДОЎ.

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра пэрыядычныя надбаўкі за выслугі гадоў да заработнае платы работнікаў страявога складу міліцыі і актыўнага складу Крымінальнага Вышуку.

Гэтая пастанова пашыраецца на малодшых міліцыянэраў, на агентаў Крымінальнага Вышуку, малодшы і сярэдні начальніцкі склад надворнай і прамысловай міліцыі і Крымінальнага Вышуку. Да заработнае платы паказаных работнікаў устанаўляюцца тры пэрыядычныя набаўкі за выслугу гадоў: для праслужыўшых без перапынку ў органах міліцыі і Крымвышуку 3 гады—10 проц. асноўнага акладу; для праслужыўшых 6 год—20 проц. асноўнага акладу; для праслужыўшых 9 год—30 проц. асноўнага акладу.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ МЯСЦОВЫХ ФІНАНСАХ БССР.

Зацьверджана рэдакцыя Палажэньня аб мясцовых фінансах БССР разам з папраўкамі, унесенымі пленумам Бюджэтнай Камісіі ЦВК.

Праект Палажэньня ў прынятай рэдакцыі ўносіцца на разгляд і зацьверджаньне бліжэйшай Сэсіі ЦВК БССР.

ПРА ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў Палажэньне аб Народным Камісарыяце Земляробства БССР. Гэта Палажэньне прынята ў адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК БССР аб рэарганізацыі і спрашчэньні савецкага апарату і пашырэньні праў мясцовае ўлады.

Напярэдадні асеньняй сяўбы.

Гэтымі днямі распачнецца адгрузка з Украіны 50 тыс. пуд. насеннага жыта.— З прычыны дажджоў сёлета ня будзе магчымасьці атрымаць з Курскай губ. 1500 цэнтн. пяткускага жыта.

Як выконваюцца пляны.

Па папярэдняму пляну асеньняй пасяўной кампаніі сёлетняга году было вызначана ўтварэньне насеннага фонду ў разьмеры 48.800 цэнтн. З гэтае колькасьці 25 тысяч цэнтнэраў павінны загатовіць савгазы Белсельтрэсту, а рэшта жыта павінна завозіцца з Украіны, Курскай губ. (пяткускае жыта) і з замежаў. Згодна паведамленьня украінскага Наркамгандлю, „Сельгаспадар" распачынае адгрузку 50 тысяч пуд. насеннага жыта для БССР з 26-га жніўня з таким разрахункам, каб закончыць адгрузку да 1-га верасьня. Кандыцыя жыта—80 пр. прахрошчанасьці, але кандыцыя гэта не праверана, яна вызначана на карні. Таму магчыма, што прахрошчанась насеньня будзе значна вышэйшая.

Што-ж датычыцца насеньня з савгасаў Белсельтрэсту, то Хлебацэнтр, па прапанове Белсельсаюзу, даў нарад савгасам распачаць агрузку 60 тысяч пуд. насеннага жыта па лініі с.-г. каапэрацыі ў райёны, слаба забясьпечаныя насеннымі жытам.

Зусім дрэнна абстаіць справа з завозам 1500 цэнтн. пяткускага жыта з савгасаў цукратрэсту (Курскай губ.) для дзяржаўных насенных культур Белсельтрэсту. З прычыны дажджлівага лета частка жыта прахросьцілася, стоячы на полі ў бабках; вызначанае жыта занадта вільготнае (20 пр. вільгаці) і ў часе перавозкі яно зусім сапрэе. У сувязі з гэтым Наркамзем атрымаў паведамленьне, што савгасы цукратрэсту адмаўляюцца выканаць дагавор на завоз у БССР пяткускага жыта.

Такім чынам, плян засеву сартавым жытам сёлета выканан ня будзе. Толькі з-замежаў мае быць атрымана па лініі Цэнтраземскладу каля 200 пуд. пяткускага жыта.

Што датычыцца завозу азімай вікі ў разьмеры 800 пуд. (500 пуд. з Украіны і 300 пуд. з-замежаў), то гэтымі днямі распачнецца адгрузка насеньня, якое адразу будзе накіроўвацца ў акругі.

У галіне забясьпячэньня БССР мінеральнымі ўгнасьнямі пакуль што ня зусім добра. 700 тон суперфасфату з-замежаў па лініі Цэнтраземскладу ўжо атрыманы, але саўвецкі суперфасфат адгружаецца даволі марудна (усяго 300 тон). Адказны супрацоўнік Наркамзему, які езьдзіў па гэтай справе ў Маскву, выявіў, што хімсындыкат дакляраваў выканаць зьдзелкі на суперфасфат, але плян завозу на фасфарытную муку, бадай, ня будзе выканан поўнасьцю, з прычыны розных перашкод у працы заводаў хімсындыкату.

Па лініі Цэнтраземскладу павінны паступіць 62 вагоны саюзнага суперфасфату, з якіх 2 вагоны ўжо атрыманы. Апроч гэтага, ёсьць весткі аб адгрузцы 20 вагонаў суперфасфату.

Фасфарытнай мукі меркавалася атрымаць 600 тон, але пакуль што адгружан 1 вагон. Ёсьць каля 20-ці тон сульфат-амонія.

Як праходзіць кантрактацыя азіміны.

У 3-х акругах: Менскай, Бабруйскай і Гомельскай будзе сёлета закантрактавана 25000 гэкт. жыта. У Менскай акрузе—8750 гэкт., Бабруйскай—12500 гэкт., Гомельскай—3750 гэкт. У вышэйпералічаных акругах заключаны дагаворы з усімі с.-г. крэдытнымі таварыствамі, якія ў сваю чаргу заключаюць дагаворы з сялянствам. У залежнасьці ад таго, да якой сацыяльнай праслойкі належыць селянін (бядняк, ці больш заможны) адпаведна выдаюцца авансы ў разьмеры да 9-ці руб. на гэктар. Дагаворы заключаюцца групавыя з кожнай групай насельніцтва паасобку.

Грошы на авансаваньне несельніцтва ўжо высланы на месцы. Апроч гэтага, усе заключыўшыя дагаворы на кантрактацыю атрымліваюць мінеральнае ўгнаеньне, с.-г. машыны і аградапамогу.

Сельска-гаспадарчыя машыны.

У часе асеньняй сяўбы сялянства будзе поўнасьцю забясьпечана с.-г. машынамі. Па лініі Цэнтраземскладу на 1-га жніўня было: 25945 плугоў, 1587 розных барон, 116 сеялак, 3996 малатарняў (павінна яшчэ паступіць 600), 1497 розных машын на апрацоўцы карміў (павінна яшчэ паступіць 895), на 10 тысяч руб. розных сродкаў на барацьбу в шкодзікамі і г.д.

Паказальныя вучасткі.

У часе асеньняй сяўбы мяркуецца залажыць пад азімыя культуры да 1500 паказальных вучасткаў, галоўным чынам, на тэмы: уплыў мінэральных угнаеньняў, торфу, лубіну на ўраджай азімых культур. Апроч гэтага, па прыкладу леташняга году будуць заложаны 200 паказальных вучасткаў з пасевамі зімовай вікі.

РАТАМСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

У Ратамскім сельсавеце зусім не арганізавана беднота і вясковы актыў. Няправільна разьмяркован лес. Наогул у сельсавеце няма парадку.

Каб праверыць усё гэта і даць належныя ўказаньні, па даручэньні сэкратара ЦВК БССР тав. Хацкевіча ў памянёны сельсавет выяжджаў інструктар арг. аддзелу ЦВК БССР т. Лаўрыновіч, разам з прадстаўніком Менскага АВК т. Сукала і супрацоўнікам нашай газэты.

У сельсавеце.

Ратамскі сельсавет зьмяшчаецца ў вялікім памяшканьні, якое стаіць побач са станцыяй.

Прышлі. Лаўкі ў хаце-чытальні стаяць дубам, сьмяцьця на 3 вазы хопіць. Мы пытаемся, чаму такі беспарадак? Нам нейкі селянін ласкава адказаў: «Пасьля спэктаклю заўсёды так». На дзьвярох пакою, дзе зьмяшчаецца сельсавет, вісяць два замкі: адзін на прабоі, а другі проста павешан на клямку.

Сельсавет займае зусім маленькі пакой. За сталом сядзіць сэкратар сельсавету, а вакол яго стаяць сяляне. Няўжо нельга зрабіць лаўкі, каб селянін, прышоўшы ў сельсавет, мог пасядзець?

— Вось, тав. сэкратар, я прышла наконт таго, каб паскорыць справу пра аліменты,—ціхім голасам гаворыць сэкратару жанчына.

— Мне справачку на пэглу.

— Мне лесу на пабудову студні.

На службе ў заможнікаў і папоў.

Лес сякуць направа і налева. Адно толькі Качынскае таварыства высекла 2000 пнёў. Лесу насеклі гэтулькі, што нават няма куды яго даваць.

Мінулай зімой разьмяркоўваўся лес. Гэтай працай кіраваў б. старшыня сельсавету Парфенчык, які так «закіраваўся», што лес атрымалі гаспадары, якія маюць па 3 дачы. Так, напрыклад, гаспадар дачы, гр. Бабіня, які атрымоўвае за дачу 650 р., Макаравіч Уладзімер, які мае дзьве дачы з прыбыткам 500 р., Шыманскі Янка, які мае 19 дзес. зямлі, паўтары дзесяціны лугу, 8 кароў і 2 коняй—усе яны атрымалі лесу пароўну з беднатой, у той час як у іх моцныя будынкі. Беднота, якая жыве ў лазьнях, прапарцыянальна атрымала такую самую колькасьць лесу, як вышэйпамянёныя гаспадары дач. Вось вам клясавая лінія ў Ратамскім сельсавеце, якую праводзіў б. старшыня Парфенчык.

Райвыканком разьмеркаваньне лесу адмяніў, зьняў з працы старшыню Парфенчыка, а таксама адзначыў, апрача лесу, дачу ільгот па страхоўцы заможнікам. Праз некаторы час сэкратар Заслаўскага РВК т. Ягоўдзік выяжджаў на месца. Ён зрабіў, як робяць усе бюракраты. Як ехаў у вёску, нават ня ўзяў з сабой нікога з сельсавету. Напісаў, наматаў і паехаў. Тут вышла цікавая справа. РВК пастанавіў лес адабраць ад заможнікаў, а фактычна яго не адабраў; такім чынам, пастанова засталася на паперы; гэтым РВК падрывае свой аўтарытэт сярод бяднейшага сялянства.

Мала таго, што лес далі заможнікам, якім ён зусім не патрэбен, старшыня сельсавету стараецца дагадзіць і папу. Так, напрыклад, б. старшыня Ратамскага сельсавету Парфенчык шмат разоў вазіў папу дровы, а адзін лясьнік таксама даваў папу дровы. Як відаць, б. працаўнікі сельсавету знаходзіліся на сталай службе ў заможных і папоў.

Беднота і актыў не арганізаваны.

Цяпер мы павінны адшукаць прычыны, чаму працаўнікі сельсавету служылі заможнікам і папам. Перш за ўсё трэба адзначыць недастатковую ўвагу райвыканкому і райкому партыі да гэтай справы і, падругое, што зьяўляецца самай галоўнай прычынай—гэта тое, што ў Ратамскім сельсавеце зусім не арганізавана беднота і вясковы бядняцкі актыў. Сельсавет ня мае на каго абапірацца, таму што ўсе сілы раздробнены. Камісіі пры сельсавеце, у якіх павінен быць згуртован увесь актыў, не працуюць. Партыйная ячэйка складаецца з 4-х чалавек і яна да гэтага часу ня ставіла пытаньня аб арганізацыі груп беднаты і правядзеньні сярод іх сталай працы. На сходах, дзе разьмяркоўваўся лес, беднота была адпыта заможнікамі,—вось чаму яны і перамаглі. Райкому партыі і райвыканкому трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на жывое кіраўніцтва працай сельсаветаў, на шырокую арганізацыю актыву і сталую працу сярод вясковай беднаты, пры дапамозе якой мы праводзім усе мерапрыёмствы партыі і савецкай улады ў вёсцы.

Усьлед за жыцьцём.

Кожнаму добра вядома, што сельсавет зьяўляецца гаспадаром усёй сваёй тэрыторыі. Ён павінен весьці масы разам з жыцьцём, а ня ісьці ўсьлед, як гэта ёсьць да гэтага часу. Тут з аднаго боку асабліва ня прыходзіцца вінаваціць працаўнікоў сельсавету таму, што працаваць у сельсавеце, дзе маецца звыш 3.000 насельніцтва—цяжка, але як-бы яно ні было, сельсавет ідзе ўсьлед за жыцьцём. Калі, напрыклад, узяць самаабкладаньне, дык яно слаба праведзена, а там, дзе самаабкладаньне праведзена добра, грошы ляжаць бяз толку. Так, напрыклад, у вёсцы Тарасава сяляне сабралі 360 руб. на пабудову мосту. РВК гэтыя грошы забраў, і ні духу, ні слуху,—усё складаюць каштарысы, пляны, а сялянства чакае. Гэты прыклад яскрава сьведчыць аб бюракратызьме і валакіце. Усякай сялянскай ініцыятыве, асабліва ў гэтай справе, трэба заўсёды ісьці на спатканьне.

Пра сяўбу с.-савет яшчэ зусім не гаварыў, бо няма ўказаньняў з райвыканкому. Праўда, калі мы былі ў с.-савеце, бачылі, што на ваке ляжаў абежнік райвыканкому да калгасу Тарасава. Вось калі райвыканком пасылае свае абежнікі, калі трэба было падрыхтоўку паставіць на поўны ход.

У вёсцы Качына.

Пазнаёміўшыся з працай с.-савету, мы накіраваліся ў вёску Качына, каб там на месцы пазнаёміцца, як разьмяркован лес і наогул, пазнаёміцца з жыцьцём вёскі.

Прышоўшы ў в. Качына, мы перш за ўсё пачалі хадзіць па паасобных гаспадарках, каб даць магчымасьць выявіць правільнасьць разьмеркаваньня лесу. Трэба адзначыць, што лесу далі заможнікам, у якіх моцныя будынкі. У вёсцы Качына маецца адзін гаспадар—былы маленькі абшарнік—хата яго пакрыта чырвонай бляхай. І вось, калі мы папалі на двор, то ўбачылі складзеныя, толькі што напілаваныя, дошкі; у загарадцы ляжыць бярвеньне. Выходзіць, што яму хоць ня так шмат, але далі лесу. Прышлі на хутар 2-х беднякоў, адзін з іх каваль. Хаты ў іх маленькія в невялікім прыдзелкам, у якім стаяць сьвіньні і каровы; асабліва слабая хата ў другога бедняка, у якога яна зроблена з лазьні. Гэтым двум беднякам лесу далі мала. Пабыўшы каля гадзіны на гэтых хутарох, мы накіраваліся на другі канец вёскі, дзе зайшлі да некалькіх беднякоў. У іх таксама не хапае будынкаў: хаты з прыдзелкам, і толькі падчыняеш дзьверы з хаты, тут кідаецца ў вочы гной, пішчаць сьвіньні...

— Як, дзядзька, вам лесу даволі далі?—пытаемся мы.

— Дзе там даволі, хату, мабыць, зраблю, а хлявы і інш. ня ведаю з чаго рабіць.

Голас сялян.

Абгледзеўшы гаспадаркі вёскі, мы рашылі склікаць агульны сход сялян. Усе хутка сабраліся. Селі мы на муроўцы, а вакол нас грамадой сяляне. Пачалі гаманіць.

— Ну, як дзядзькі, што чуваць наконт лесу?

Уся грамада сялян маўчыць, паглядаючы адзін на другога.

— Пусьціце мяне бліжэй,—крыкнуў селянін, сядзеўшы на загародзе,—нашчэн с.-савету ды іншыя гр-не, атрымаўшы лес, прадаюць яго. Дык вось запытайцеся, ці трэба было ім даваць лес.

— Насеклі лесу гэтулькі, — падняўшыся, сказаў брат каваля,—што ў кожнай хаце можна на пнях гуляць у «очко».

— Ты, брат, маўчы, мы ведаем, што ты лес прадаеш і ў карты праігрываеш,—крыкнулі ў адзін голас некалькі сялян.

Агнятрывалае будаўніцтва ў вёсцы Качына.

Вёска Качына па свайму складу бядняцка-серадняцкая. Сяляне прымаюць актыўны ўдзел у агнятрывалым будаўніцтве. У вёсцы Качына маецца 3 таварыствы: бэтоннае, чарапічнае і цагельнае. У гэтых таварыствах 405 пайшчыкаў з 3-х суседніх райёнаў. Ужо 13 хат у вёсцы Качына пакрыты чарапіцай. З бэтону робяць зрубы для студняў. Такім чынам, праца гэтых таварыстваў можа паступова замяняць лес і будаваць агнятрывалую вёску. Апрача гэтага, на балоце каля вёскі Качына сіламі сялян выраблецца торф, які паступова можа замяняць дровы. Маецца школа, дзьве радыё-ўстаноўкі, выпісваецца амаль на кожны двор газэта.

Настаўнік—у хвасьце.

Культурных сіл у вёсцы Качына зусім няма. Ёсьць толькі адзін настаўнік Мухніцкі. У яго такая манера, што ён заўсёды ідзе ў хвасьце, наогул, хоча ўсім дагадзіць. Калі, напрыклад, сяляне аб чым-небудзь гавораць, дык ён перш паслухае, а пасьля ім гавора: так, так.

Асаблівай культурна-асьветнай працы не ведзецца, ня гледзячы на тое, што ў сялянства ў гэтай адносіне маецца вялікая ініцыятыва, якую можна скарыстаць для хутчэйшай перабудовы вёскі.

— Вы, хлопцы, чаму не паступаеце ў камсамол?—запыталі мы.

— Што-ж, паступілі-б, ды няма арганізатара.

— А ратамская камсамольская ячэйка?

— Што ратамская? Яны ніколі да нас ня прыходзяць, хоць тут і ўсяго адна вярста.

— А вы, настаўнік, як працуеце?

— Працую патроху

У ПАГОНІ ЗА ВЕДАМІ.

(З курсаў сялянак-актывістак).

Вось ужо 2 месяцы кіпіць праца ў памяшканьні Беларускага Камвузу.

15 чэрвеня са ўсіх куткоў Беларусі зьехалася некалькі дзесяткаў сялянак-актывістак, каб, набыўшы шэраг патрэбных ведаў, зноў вярнуцца ў вёску і павесьці барацьбу за новы быт, павесьці культурную рэвалюцыю ў нашай яшчэ цёмнай вёсцы.

Курсантак—60 чалавек ва ўзросьце ад 18 да 40 гадоў. Яны, члены сельсаветаў і найвышэйшага органу ў рэспубліцы—ЦВК БССР, усе з аднолькавым захапленьнем набываюць новыя веды.

Матэматыка і ленінізм, родная мова і практычныя пытаньні савецкага будаўніцтва—усё адполькава цікавіць нашых актывістак. Нагрузка на курсах досыць вялікая—7-8 гадзін штодзённай вучобы.

— Мы з вялікай ахвотай будзем вучыцца звыштэрмінова,—кажа адна з жанчын.

— Так, так, звыштэрмінова, абы набыць больш ведаў,—падтрымоўваюць свайго таварыша па вучобе і іншыя курсанткі.

Сялянкам-актывісткам мала праграмных заняткаў, і яны ўсе працуюць добраахвотна ў гуртку па прапрацоўцы праграмы і статуту партыі.

Вольны час курсанткі скарыстоўваюць для таго, каб пачытаць кніжку, каб выдаць сваю насьценгазэту. За час існаваньня курсаў ужо пасьпелі наладзіць 2 вечары самадзейнасьці, выступаў свой хор, выдалі сьветавую газэту, выступалі з дэкламацыяй. Адным словам, праца на курсах кіпіць ва ўсю.

— Дарослыя жанчыны займаюцца з такой-жа ахвотай, як і маладыя дзяўчаты,—кажа адна з курсантак. Падцьвяржае гэта і загадчыца курсамі.

—Усе гараць адным жаданьнем, каб за невялікі тэрмін вучобы набыць як мага больш ведаў.

Вось што гаворыць адна з курсантак пра заняткі.

—... Вядома, усё мы запіоалі ў ошыткі...
Дзяўчаты бойкія і да таго ўжо прыткія,
Хоць і вяскоўкі, але як пачнуць
лапатаць...

Як паляцяць са ўсіх куткоў запытаньні,
Настаўнік не пасьпявае адказаць...

Так, жаданьне вучыцца ў курсантак надзвычайнае.

— Усё, з чым нам даводзіцца сустракацца пры практычнай працы ў сельсавеце, курсы нам усё гэта добра растлумачваюць,—кажуць курсанткі.

— Прыеду пасьля заняткаў у вёсну, дык змагу і сама падатак у сельсавеце падлічыць,—а ўсё матэматыка дапамагае,—адзначае дарослая жанчына.

5-га верасьня адбудзецца ўрачысты выпуск.

— Будзем працаваць звыштэрмінова,—вось агульны голас нашых актывістак-жанчын.

Хаты-чытальні патрабуюць увагі.

Надыходзіць восень, а там і зіма са сваімі доўгімі вечарамі. Падробяцца трохі сяляне па гаспадарцы і пацягнуцца групкамі да хаты-чытальні, каб скрыстаць свой вольны час, даведацца аб сіх-тых навінах.

У гэты момант х.-чытальня павінна заняць самае пачэснае месца сярод іншых культасьветных установ вёскі.

Яе задачы, пры нясупынным уздыме культурнага ўзроўню вясковага насельніцтва, надзвычайна сурёзныя і яны вымагаюць максымальнай увагі, як з боку асоб, непасрэдна кіруючых працай у чытальні, так і належных установ.

Галоўнай прычынай нездавальняючай працы х.-чытальняў да гэтага часу была адсутнасьць усялякага кантролю над іх працай з боку інспэктарскага нагляду.

Цэлымі гадамі ніхто не знаходзіць патрэбным туды заглянуць, азнаёміцца з працай, зазначыць недахопы ў працы, даць правільны напрамак і параду хатніку, які кожную мінуту мае ў гэтым патрэбу.

Таксама да недахопаў у працы некаторых х.-чытальняў трэба аднесьці адсутнасьць шырокай справаздачнасьці хатнікаў перад насельніцтвам і рознымі арганізацыямі. Праўда, хатнікі адчытваюцца на закрытых сходах ячэек КП(б)Б, але гэтага мала.

Праца чытальні—праца шырока грамадзкая і сама грамадзкасьць павінна таксама прымаць у ёй удзел.

Вялікім недахопам у працы чытальняў трэба адзначыць і слабую ўвагу з боку РВК у сэнсе матар'яльнага забясьпечаньня іх. У сэнсе рамонту, задаволеньня інвэнтаром, літаратурай. Вясковыя чытальні заўсёды застаюцца на апошнім месцы.

Адгэтуль і выгляд нашых чытальняў, як правіла: пабітыя шыбы, паламаная мэбля, сцэна з трох вадзікаў, абшарпаныя сьцены, а ў шафе сотня-другая зацухмоленых устарэлых брашур—вось і ўсё, што мы знойдзем у большасьці вясковых чытальняў.

З такімі зьявішчамі, бязумоўна, трэба пакончыць. На рубяжы 12-й гадавіны Кастрычніка хаты-чытальні, як асяродак культуры на вёсцы, пакідаць на правох падчарыцы недапусьціма. Трэба назаўсёды адкінуць думку, што хаты-чытальні могуць існаваць на самаапладе, як, напр., ад даходаў па пастаноўцы спэктакляў і г. д. Гэта настолькі мізэрныя даходы, што хатнікі на іх ня могуць купіць нават скрынчку грыму.

Дзеля ажыўленьня працы ў чытальнях неабходна зараз-жа врабіць усе захады. У першую чаргу яны павінны быць абсьледаваны інспэктарамі, як асобамі, кампэтэнтнымі ў палітасьветнай працы. Тут-жа разам з хатнікам і актывам учыніць нараду савету чытальні, на якой, улічыўшы ўсе абставіны і ўмовы працы чытальні, даць сталы напрамак да ажыўленьня працы.

У працэсе працы хатнікі павінны бліжэй падыходзіць да насельніцтва, знаёмячы яго з працай чытальні.

Ня трэба баяцца здаровай крытыкі з боку грамады. Да яе трэба прыслухоўвацца, бо яна дапаможа хатніку падмячаць свае хібы і тым самым выпраўляць працу. Усе заўвагі, здаровая крытыка грамадзкасьці дапаможа хатніку зблізіцца з масамі і агульнымі сіламі паставіць х.-чытальню на тую вышыню, на якой яна павінна стаяць.

Паколькі добрая чытальня на вёсцы мае вялікае палітычнае значэньне, настолькі РВК павінны зьвяртаць на іх сваю ўвагу. Трэба адмовіцца ад прынцыпу даваць сродкі чытальні толькі тыя, што застаюцца, а ня тыя, што просіць хатнік па каштарысу. Наогул, на хаты-чытальні трэба зьвярнуць такую-ж увагу, як мы зьвяртаем на школы сацвыху, як у сэнсе кантролю за працай, так і з боку матар'яльнага яе задаволеньня.

П. Брыцька.

З лістоў рабселькораў.

Камсамольцы адрамантавалі мост.

Мост у в. Карнілаўцы быў такі дрэнны, што ніяк па ім нельга было езьдзіць. Сяляне ламалі калёсы, калечылі коняй. Да рамантаваньні мосту ніхто не турбаваўся, пакуль за гэту справу не ўзяліся карнілаўскія камсамольцы. Дружнай працай яны адрамантавалі мост і цяпер сяляне езьдзяць і дзякуюць камсамольцам.

Глускі р., Бабруйшчына.

Чаму не скарыстоўваюць торфу?

Клімавіцкая арцель на пагельні камхозу абпальвае цэгалу. Арцель дроў ня мае, ды і купіць дорага, дык яна па гораду купляе ў крэдыт стары будынак хаты і гэтым паліць.

Але-ж старога будынку на доўгі час ня хопіць.

Між тым, у адным вярсьце ад цагельні маецца гатовы, нарэзаны торф, які гіне ні за нішто.

Камхозу можна было-б паслаць на цагельню свайго тэхніка, каб ён паказаў рабочым, як зрабіць пад печамі дзіркі і вывесьці трубы для скарыстаньня торфу.

Ад гэтага стала-б цэгла таньней, ды некаторым хатам і лесу здаравей.

Федаровіч.

Што гэта за парадак?

Кірык Прыленаў з в. Абідавічы, Журавіцкага р-ну (Магілеўшчына) за зьверскае забойства сам'і ў вёсцы Бахані ў лістападзе м-цы 1926 г. быў засуджан на 10 год зьняволеньня з высылкаю за межы Беларусі пасьля адбыцьця пакараньня.

Цяпер гэты Прыленаў зьявярнуўся дадому і спакойна жыве сабе ў вёсцы. Сяляне в жахам спатыкаюцца з Прыленавым і з вялікім здзіўленьнем пытаюць, чаму гэта злачынцу выпусьцілі праз кароткі час і чаму ён ня выслан?

К—н.

Прапаную такую рацыяналізацыю

Пры Халопеніцкім нардоме маецца бібліятэка, дзе працуе загадчык бібліятэкі і атрымлівае пэнсію 38 руб. у м-ц. Але загадчыку няма чаго рабіць, бо кніг вусім мала там, і яны вусім нягодныя, старыя, ніхто іх не бярэ. За некалькі месяцаў зьмяніліся тры загадчыкі, з прычыны чаго праца бібліятэкі культае; кнігі валяюцца па ўсёй бібліятэцы, і там няма ніякага толку. Загадчык нардому вусім гэтым ня цікавіцца, хоць яму самому няма чаго рабіць. За ўсю зіму ён толькі выпусьціў адну насьценгазэту пра нардом. Па мойму, можна было-б звольніць загадчыка бібліятэкі, бо загадчык нардому можа выканаць гэту работу і за грошы, якія адпускаюць загадчыку бібліятэкі, трэба купіць больш кніг.

Ліўшыц.

Лельчыцкая цеганіна.

У іншых установах стараюцца змагацца з цеганінай і ў нас аб гэтым гаворыць на сходах, аднак Лельчыцкі РВК робіць інакш.

Калі вартаўніку гэтага РВК прыслалі паведамленьне, дык замест таго, каб проста ўручыць яму паведамленьне, бяруць і запісваюць яе ў РВК ў кнігу выходзячых папер, потым у разносную кнігу і пасылаюць з гэтым-жа вартаўніком у сельскі савет, каб ён яе там атрымаў. Гэта дробны факт, але ён не адзін.

Ф. Ш.

Трэба паправіць недахопы ў асеньнюю сяўбу.

У сялян Кляноўскага с.-савету—Дубровенскага р-ну, Аршанскай акругі, больш як на палову засталася незасеянай у яравым кліне зямля.

Летась быў кепскі ўраджай—вымакла яравіна і ні ў каго не знайшлося насеньня.

Камітэт узаемадапамогі абяцаў даць перад сяўбой насельніцтву колькі патрэбна насеньня, але як прышлося да справы, дык ня было чым сеяць. На кожную вёску к-т даў толькі па 15 пудоў аўса, які ў некаторых вёсках дзялілі на фунты, бо патрабуючых было шмат.

Крэдытнае т-ва выдавала сваім членам прыблізна па 8 пудоў кожнаму.

Кожны селянін хацеў-бы быць членам т-ва, каб атрымаць пазыку, але ня кожнаму гэта даступна.

Дубровенскі РВК не зьвяртае належнай увагі, каб забясьпечыць насеньнем сялян.

Трэба хоць у асеньнюю сяўбу засеяць усю зямлю, бо пяжка будзе выплаціць падатак, калі будзе пуставаць зямля.

Хліманові Ільля.

Плачуць людзкія грошы.

У вёсцы Вышняя-Олба (Жлобінскі р-н) маецца адзяленьне Стрэшынскага спажывецкага т-ва. Толькі ніхто туды не нясе паёў—напужалі ўсіх растратчыкі. Не пасьпелі забыць мінулагодняй, як ужо маецца новая. Сяльчанін Шашкоў Амяльян быў абран у т-ва, як сумленны чалавек, але ён баяўся ўрабіцца ў муку толькі першыя 3 м-цы. Потым патрабавалася Шашкову зрабіць 2 вясельлі—сабе і сястры. Тут з ім і здарыўся грэх. Ён вазіў вазамі гарэлку, піва, шыў нявесткам сукенкі, цешчы бацінкі, а бацьку і цесьцю купіў па каню.

Калі рабілі прыняцьці Шашкова рэвізію, якія гулялі да таго на вясельлі, дык нічога кепскага і не заўважылі. Праз месяц-жа Стрэшынскае праўленьне на рэвізіі ўстанавіла растрату на 559 руб. 54 кап., але, махнуўшы на гэта рукою, паехалі і пакінулі Шашкова зноў на працы. Апошні праз два тыдні пасьля гэтага павялічыў растрату, давёўшы яе да 700 руб. Суд прыгаварыў Шашкова на 2 гады зьняволеньня.

Аднак, ці ня віноўна яшчэ і Стрэшынскае праўленьне спаж. т-ва, якое дапусьціла новую растрату пасьля таго, як заўважыла яе пры ранейшай рэвізіі?

Пашноўскі Юрка.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да 10-й гадавіны агалашэньня БССР.

У Нар. Кам. Асьветы БССР распачалася падрыхтоўка да адзначэньня 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР. Да юбілею Нар. Кам. Асьветы выпускае папулярную брашуру. Складаньне гэтай брашуры мяркуецца даручыць пісьменьніку Міхасю Зарэцкаму.

Да юбілею таксама будуць выпушчаны мастацкія карціны.

У сувязі з гэтым Галоўмастацтва скліпае ў бліжэйшыя дні нараду беларускіх мастакоў, дзе будзе абгаворана пытаньне аб удзеле іх у юбілеі.

Мяркуецца выдаць карціны на наступныя тэмы: «Падпісаньне маніфесту аб БССР», «Ад веку мы спалі», «Партызанщына пры акупацыях», „Будаўніцтва ў БССР" і г. д.

За лепшыя карціны мастакам будуць выдадзены прэміі

Чакаецца прыезд украінскай сялянскай экскурсіі.

Цэнтральны камітэт незаможных сялян Украіны зьвярнуўся з запытаньнем у Нар. Кам. Асьветы аб магчымасьці прыслаць у БССР украінскай сялянскай экскурсіі з мэтай азнаямленьня з жыцьцём і бытам працоўных БССР. Нар. Кам. Асьветы даў на гэта сваю згоду, і ў хуткім часе чакаецца прыезд у БССР сялян-экскурсантаў у ліку каля 100 чал.

Экскурсантам мяркуюць паказаць: Менскую балотную станцыю, дасьледчы інстытут сельска-гаспадарчай і лясной гаспадарні імя Леніна, сельска-гаспадарчы музэй, драмдзіновы, скураны і дрэваапрацоўчы заводы.

Апрача гэтага, экскурсанты наведаюць вёску «Блонь» (Пухавіцкі раён) і сельска-гаспадарчую камуну «Зьвязда».

Украінская сялянская экскурсія прабудзе ў БССР каля 5-ці дзён.

БССР НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СПАРТАКІЯДЗЕ.

Па баскэтболу каманда БССР вышла ў фінал.

У фінал па баскэтболу вышла беларуская каманда разам з украінскай камандай. Матч фінальны вырашыць агульнае першынства.

Праігрыш па футболу і гарадкох.

Як і трэба было чакаць, Беларусь праіграла Украіне па футболу з вынікам 6:2.

Па гарадкох каманда БССР праіграла фінальны матч таксама Украіне.

Футбольны матч Беларусь—Фінляндыя.

Для выяўленьня 3 і 4 месца ў агульным першынстве СССР па футболу сустакаюцца каманды Беларусі і Фінляндыі.

Першынства Беларускай В.А.

Па пераходу 25 кілёмэтраў другое месца заняла каманда Беларускай Вайсковай Акругі.

Футбольная каманда БВА праіграла камандзе Чырвонага флёту, застаўшыся, гаткім чынам, на другім месцы.

Прыватнае будаўніцтва Менску.

Гарадзкі архітэктар атрымаў да 300 заяў аб капітальным рамонце ў прыватных дамох. У большасьці выпадкаў капітальны рамонт праводзіцца ў невялічкіх драўляных дамох на суму ад 200 да 500 руб. кожны.

Новае будаўніцтва і капітальны рамонт найбольш інтэнсыўна разгорнуты ў паўдзёва-заходняй частцы гораду. Будуюцца і праводзяць капітальны рамонт рабочыя, радка—самбутэлікі і зусім малы процант непрацоўнага элемэнту. Прыватнае будаўніцтва жалезам было забясьпечана большымі добра. Назіраецца недахоп цэглы, але паступова ўсе заяўкі на апошнюю пакрыху здавальняюцца.

Машына для вырабу вадкага паветра.

Фізычны Інстытут БДУ атрымаў з Нямеччыны машыну для вырабу вадкага паветра. Машына будзе вырабляць каля 3-х літраў вадкага паветра ў гадзіну, што дасьць магчымасьць забясьпечыць ім усе зацікаўленыя ў БССР установы.

Магутнасьць рухавіка машыны—10 конскіх сіл, вага—100 пудоў.

Падрыхтоўка да І-й аўталётарэі.

Праўленьне аўтадору БССР ядзе падрыхтоўку да рэалізацыі білетаў 1-й аўталётарэі. Ужо дана заяўка аўтадору РСФСР на 100.000 лётарэйных білетаў, якія маюць прыбыць у пачатку верасьня. Каштоўнасьць кожнага білету—50 кап.

У ліку галоўных выігрышаў маюцца: 21 аўтамабіль, 20 матацыклаў, 200 матораў к лодкам, 600 вэлёсыпэдаў і 50 аўтамабільных паездак па ўсяму Саюзу. Усяго маецца 3391 выігрышаў на суму 205.500 р.

Каналізацыйныя работы ў Менску.

„Водаканал" прыступіў да пракладкі галоўнага каналу—калектару, які ідзе па бераве ракі Сьвіслач каля 2-й савольніцы. Адначасова працягваецца пракладка вулічнай каналізацыйнай сеткі і пабудовы насоснай станцыі (на рагу Сьлёсарнай вул. і Пуліхоўскай Слабодкі).

Падрыхтоўка да хлебазагатоўчай кампаніі.

Падрыхтоўчая праца да надыходзячай хлебазагатоўчай кампаніі Белсельсаюзам ужо праведзена. Усяго Белсельсаюз павінен загатовіць для Саюзхлеба 750000 пуд. усіх зернапрадуктаў. Ужо праведзена разьмеркаваньне па акруговых саюзах і пераведзёны акругам грошы для правядзеньня загатовак. На днях закончылі працу 6-ці тыдзённыя курсы на перападрыхтоўцы загатоўчага апарату.

Да пабудовы Беларускай Геафізычнай Абсэрваторыі.

Беларускі Дасьледчы Інстытут Сельскай і Лясной гаспадаркі склаў праэкт пабудовы Беларускай Геафізычнай Абсэрваторыі. Абсталяваньне для Абсэрваторыі заказана часткова ў Нямеччыне, часткова ідзе закупка ў СССР.

250 месц для студэнтаў-практыкантаў.

Сёлета ВСНГБ прадставіў для стажораў і практыкантаў тэхнікумаў і вышэйшых навучальных устаноў БССР і РСФСР 250 месц для практыкі. Да гэтага часу ўжо практыкуюць 130 чалавек. Наглядзецца нездахоп практыкантаў-папярнікаў, будаўнікоў з вышэйшай адукацыяй і скурнікаў.

На карысьць бяспрытульных.

Скарбоначны збор на карысьць бяспрытульных дзяцей даў па Менску каля 300 р. Скарбоначны збор будзе праводзіцца ва ўсе сьвяточныя дні ў працягу месячніка.

Вывучэньне сьвінагадоўлі ў БССР.

Беларускі Інстытут Сельскай і Лясной гаспадаркі арганізуе экспедыцыю для вывучэньня сьвінагадоўлі ў БССР. Экспедыцыя ахоплівае 25 раёнаў, каля 15 тысяч двароў і 30 тысяч сьвіней. Дасьледваньне праводзіцца ў мэтах вывучэньня якасьці беларускага сьвінога матар'ялу ў сэнсе прыгоднасьці яго для бэканізацыі.

Сялянскія арцелі па выпрацоўцы мастацкіх тканін.

Беларускі саматужна-прамысловы саюз прыступіў да арганізацыі ў 3-х раёнах БССР сялянскіх арцеляў па выпрацоўцы мастацкіх тканін. Ужо заказаны спэцыяльныя станкі. Адначасова з гэтым у Менску арганізуецца вялікая-фарбовачная арцель, якая будзе абслугоўваць вышэйадзначаныя арцелі і Менскую арцель пашыўнікаў.

Аб прыёме ў 5 групу 7-хгодкі.

Нар. Кам. Асьветы БССР даў указаньне ўсім акруговым Інспэктарыятам Нарасьветы аб прыёме без іспытаў у 5 групы сямігадовых школ асоб, якія скончылі 4-х гадовыя школы. Гэткія вучні будуць прымацца на падставе сацыяльнага адбору і выпісак з пратаколаў камісіі па калёкіўму аб іх пасьпяховасьці.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 23-VIII-1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—68, куп. 4—66.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—20, куп. 5—18.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—03,5, куп. 5—01,5

Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 26,17, куп. 26—07.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 122,75, куп. 120,75.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 102—76, куп. 102—71.

Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—13, куп. 25—03.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 23-8 пастаноўка калектыву расейскай драмы «Жена по паспорту». Пачатак а 9 гадз. Білеты—25 і 30 к.

ДА ВЕДАМА НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ.

Куток навуковых працаўнікоў пасьля летняга перапынку пачынае сваю працу з 1-га верасьня.

Адчынен штодня, акрамя аўторнаў, з 7—12 г. увеч. Бібліятэка з 7 да 10 гадз. увечары.

Менскі дзень.

4.000 руб. адпушчана на пашырэньне інвалідзкай сьлясарна-кавальнай арцелі № 2.

26 жніўня заканчваецца ў менскіх школах сацвыху рэгістрацыя ўноў паступаючых і старых вучняў. Заняткі распачнуцца з 1-га верасьня.

На торфараспрацоўкі Міхановіцкай тарфяной гаспадарні адпусьціў 5000 руб. крэдыту Беларускі Сельска-Гаспадарчы Банк.

835.000 руб. крэдыту мяркуе адпусьціць акругам Белкамуньбанк на пашырэньне электрыфікацыі ў 1928-29 г., што дае павялічэньне супроць крэдытаваньня бягучага году на 65 проц.

3.960 бочак нарвежскіх селядцоў прызначана завезьці ў БССР у бліжэйшым часе.

Зборнік праграм 2-га канцэнтру сямігодкі выходзіць у бліжэйшыя дні і будзе разасланы па акругах. Апрача таго, у № 5 часопісі «Асьвета» друкуецца праграма школ сялянскай моладзі

Скончыўся прыём у Менскую прафтэхшколу швэйнікаў. З 160 пададзеных заяў прынята 40 чал.

2-хчасовы суботнік „наш падарунак Кіму" пастанавіў правесьці на акрузе Менскі акругом ЛКСМБ 25-га жніўня.

2.200 чал. будзе прынята сёлета ў менскія сямігодкі. Заняткі пачнуцца 1-га верасьня.

На будаўніцтве трамваю.

У нядзелю ў Менск прыехалі 2 інструктары па тэрмітавай спайцы рэек. Рабочую сілу для гэтай работы пастакоўлена ўзяць з Менскай Біржы Працы. Інструманты ўжо знаходзяцца ў дарозе, і як толькі прыбудуць у Менск, зараз-жа пачнецца спайка рэек, і работы па пракладцы трамвайных шляхоў пойдуць нармальным тэмпам.

Іспыты на рабфаку скончаны.

Іспыты на Менскім рабфаку адбываліся ў працягу 5 дзён (з 16 да 21 жніўня).

Да іспытаў было дапушчана 260 чал., пераважна рабочых і батракоў. Сёлета ў адносіне батрацкага складу маюцца пэўныя дасягненьні. Сялянскі склад таксама прадстаўлен добра—пераважна беднота.

Прынята на першы курс 100 чал. і на яўрэйскае аддзяленьне—30 чал.

Як недахоп, трэба адзначыць тое, што некаторыя ўстановы спазьніліся з прысылкай кандыдатаў, а некаторыя райёны нядбайна адносіліся да пасылкі таварышоў на рабфак. Так, напрыклад, адзін райён камандыраваў 16-гадовага хлапчука, у той час, калі ўсім вядома, што на рабфак прымаюцца асобы ад 18-гадовага ўзросту. Што датычыцца яўрэйскага аддзяленьня, то на яго зусім мала прыслана рабочых з вытворчасьці. Гэта сьведчыць аб тым, што на масцох наўважліва адносіліся да падбору добрых кандыдатаў на яўрэйскае аддзяленьне.

І, урэшце, трэба адзначыць недастаткову колькасьць камандыраваных жанчын, асабліва работніц.

Прыём на вячорні рабфак пачнецца з 1-га верасьня, будзе прынята 100-120 чал.

Культурныя навіны.

Падрыхтоўка новага кадру настаўнікаў.

У пачатку верасьня мяркуецца арганізацыя настаўніцкіх курсаў, якія будуць камплектавацца з бесрапоўных Біржы Працы. На курсы будуць прыняты 100 асоб, якія маюць сярэднюю адукацыю.

Вывучэньне народных сьпеваў Магілеўшчыны.

Сябра Магілеўскага краязнаўчага т-ва т. Сушынскі, які працаваў супольна ў часе экспедыцыі з выкладчыкам музыкі і сьпеваў Магілеўскага Белпэдтэхнікуму т. Чуркіным, сабраў каля 300 народных песьняў (слоў і мэлёдый). Сабраны матар'ял зьяўляецца вялікай вялікай каштоўнасьцю. Песьні перададзены у Інбелкульт.

Зборнік „Віцебшчына".

Віцебскае краязнаўчае т-ва выдала зборнік «Віцебшчына», што зьяўляецца вялікай працай у галіне вывучэньня вытворчых сіл акругі, яе гістарычнага мінулага і сучаснага культурнага стану. У гэтай працы прынялі ўдзел як спэцыялісты-вучоныя, так і маса працоўных праз краязнаўчыя арганізацыі.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газ. „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. «Полымя» № 5, беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі. Стар. 174, цана 1 руб. 25 кап.

2. «Літаратурная хрыстаматыя» частка 2. Г. Лібраў. Стар. 397, цана 2 руб. 50 к. (На яўрэйскай мове).

3. «Пахаджэньне рэлігіі» С. Матулайціс. Стар. 61, цана 85 кап. (На літоўскай мове).

4. «2-гі ўсебеларускі зьезд яўрэяў-сялян» (стэнаграфічная справаздача). Выданьне нацкамісіі пры ЦВК БССР. Менск. Стар. 257, цана 1 руб. 50 кап. (на яўрэйскай мове).

5. „Революция и культура" № 14, стар. 80, цана 50 кап. Выданьне газ. «Правда». Масква.

Да ўсіх партыйных, прафэсыйных, літаратурна-навуковых, савецка-гасп. і грамадзкіх арганізацый.

Белдзяржкіно ў гэты час распрацоўвае гадавы і пяцігадовы вытворча-тэматычны плян.

У аснову тэматычнага пляну будзе ўзята агульная ўстаноўка, дадзеная партыйнай нарадай па пытаньнях кіно: «Агульна-палітычны вымест карціны савецкага кіно павінен быць прапагандай у мастацкай форме, праз паказ на экране новых сацыялістычных элемэнтаў у гаспадарцы, у грамадзкіх адносінах, у быту, у асобе чалавека, у барацьбе супроць перажыткаў старога ладу, да асьветы мас, да іх выхаваньня і арганізацыі вакол культурных, эканамічных і палітычных задач, якія ажыцьцяўляюцца ў пярэд сацыялістычнага будаўніцтва пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі, да клясавага асьвятленьня гістарычных падзей і грамадзкіх зьявішч; да распаўсюджаньня агульных ведаў, да інтэрнацыянальнага выхаваньня мас і перамогі нацыяналістычных забабонаў і правінцыяльнае абмежаванасьці, да далучэньня мас праз кіно да ўсіх дасягненьняў сусьветнае культуры, да арганізацыі адпачынку і забавы, але так, каб і зусім забаўны матар'ял кіно арганізоўваў думку і пачуцьцё гледачоў у рэвалюцыйным пралетарскім кірунку».

Маючы пад увагаю гэтыя агульныя задачы палітыкі партыі ў галіне кіно, Белдзяржкіно першай задачай свайго тэматычнага пляну будзе ставіць вытворчасьць кіно-фільм на нацыянальныя тэмы, якія адбіваюць рэвалюцыйную барацьбу рабочых і сялян у Беларусі ў мінулым (гістарычна-рэвалюцыйныя), жыцьцё, быт і супрацоўніцтва працоўных розных нацый БССР і іх удзел у сацыялістычным будаўніцтве ў сучасным (сяцыяльна-бытавыя), адбіваючых працэс сацыялістычнага будаўніцтва і дапамагаючых клясаваму выхаваньню шырокіх працоўных мас (індустрыялізацыя краіны, калёкіўнае і калектывізацыя вёскі, узмацненьне змычкі рабочае клясы з сялянствам, барацьба за культурнасьць у горадзе і вёсцы, а таксама дзіцячых, навуковых карцін і кіно-хронікі, аднак, не абмяжоўваючыся вытворчасьцю карцін на нацыянальныя тэмы, а мець пад увагаю агульна-савецкія тэмы.

Адбіцьцё вышэйпамянёных задач у пяцігадовым пляне магчыма толькі пры актыўным удзеле ўсіх зацікаўленых арганізацый у гэтай рабоце, прыцягненьню якіх павінны паслужыць гэты ліст.

Вельмі просім усе зацікаўленыя арганізацыі, на магчымасьці ў карацейшы тэрмін прысылаць свае канкрэтныя ўказаньні ў Белдзяржкіно, якія-б тэмы лічылі неабходнымі ўключыць у гэты плян. Указаньні тэм дажадана атрымаць у больш распаўсюджаным відзе.

Пасьля скончэньня распрацоўкі гэтага пляну і да канчатковага яго зацьвярджэньня ён будзе апублікаван і прадстаўлен на шырокае абгаварэньне арганізацый і працоўных мас, указаньні якіх будуць бацьмоўна прыняты пад увагу.

Распрацоўка гэтага пляну, шырокае апублікаваньне яго, свачасная загатоўка сцэнарыяў на вызначаныя тэмы, магчымае наладжаньне конкурсаў на напісаньне сцэнарыяў па найбольш балвых пытаньнях—палегчыць высоўваньне з колаў пралетарскіх мас новых кадраў сцэнарыстаў і паможа зьявішчыць сцэнарны крызіс.

Прыцягненьне грамадзкае ініцыятывы да распрацоўкі гэтага пляну,—адзіны поўны і надзейны шлях для стварэньня сапраўднае сацыялістычнае кіно-продукцыі.

Белдзяржкіно ўяўляе, што зацікаўленыя арганізацыі адгукнуцца на гэты ліст і прымуць актыўны ўдзел у распрацоўцы гадавога і пяцігадовага пляну вытворча-тэматычнага пляну.

Канчатковую распрацоўку пляну мяркуецца скончыць да 15 верасьня г. г.

З таварыскім прывітаньнем.

БЕЛДЗЯРЖКІНО: Галкін, Кацнэльсон.

БІБЛІАГАРФІЯ.

М. Уцехін. ЯК ЗАХАВАЦЬ ЗЯЛЁНЫ КОРМ НА ЗІМУ. БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА. Менск, 1928. Стар. 48. Цана 25 кап.

У гады бяскорміцы, якія здараюцца часта, калі на палёх больш сьмяцьцёвых траў чымся збожжа, гаспадаром прыходзіцца задумвацца над тым, чым і як пракарміць скаціну доўгаю зімою, каб яна мела магчымасьць дажыць да веснавога падножнага корму.

Гаспадару прыходзіцца зьвярнуць увагу і на сьмяцьцёвыя травы і на ўсё тое, што можа быць кормам у зімовы час. Кніжка М. Уцехіна апісвае адзін з спосабаў, як, папершае, паленьшыць смак і нератраўліваньне сьмяцьцёвых траў, якіх часта шмат на палёх, пустках, у сядзібах і г. д., падругое—кніжка апісвае, як выкарыстаць на корм тое, што ня можа быць спажыта скаціною ў сьвежым выглядзе і, патрэцяе, хоча паказаць, як такі корм захаваць на зіму.

Кніжка складаецца з практычных нарад, як захаваць корм у ямах, дзе можна капаць ямы, як арганізаваць сьцены ямы пры слабым грунце, якой глыбіні, шырыні і даўжыні павінна быць яма, як нарыхтоўваць матар'ял для сіласаваньня (квашаньня), як закладаць корм у яму і сапіць яго, як забясьпечыць корм ад псаваньня ў ямах, аб спосабе і глыбіні закіданьня ям зямлею, аб працягласьці захаваньня корму ў ямах, аб дагляданьні ям у працягу асяданьня корму, аб наступленьні сьпеласьці квашанага корму, аб працягласьці захаваньня корму ў ямах, аб раскрываньні ям і парадку выбіраньня корму, аб уліку квашанага корму на скаціну, аб норме квашанага корму скаціне і г. д.

Як бачым, аўтар дае падрабязныя тлумачэньні, як выкарыстаць для корму тое зельле, якое ў нас прападае зусім даром, але якое пры жадаўні можа выратаваць гаспадарку ад зруйнаваньня ў неўраджайныя гады, а ў ураджайныя падвоіць яе прыбытковасьць.

«Калі,—кажа М. Уцехін,—амэрыканскія фэрмэры (хутаране) бачаць у сіласаваньні корму паратунак ад бяскорміцы і гаворыць (у прыказках), што „можна пачаць гаспадарыць бяз гумна, але не бяз сілосу" і што «вамест адной каровы пры сілосе гадуюцца дзьве», дык тым больш нам трэба зьвярнуць увагу на тамны і заўсёды поўны спосаб гадаваньня і павялічэньня колькасьці скаціны ў гаспадарках—на сіласаваньне корму для зімовага кармленьня скаціны, якая мае ў такой меры вялікае значэньне ў гаспадарцы, што можна сьмела сказаць: калі скаціна сытая, дык і гаспадар сыты, але не наадварот.

Кніжка каштуе толькі 25 кап. і таму даступна кожнаму нашаму селяніну-гаспадару, якім мы і раім з'ёю азнаёміцца і набытыя веды прымяніць на практыцы.

П. Т.

Суд.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ.

У канцы 1925 году ў Барысаве быў арганізаваны гарадзкі камбінат, які аб'ядноўваў 11 прамысловых прадпрыёмстваў.

У склад праўленьня камбінату былі прызначаны: Біргер Абрам (старшынёй праўленьня), Шліонскі-Громаў Цэзар (ягоны намесьнікам і загадчык друкарні і камэрцыйнай часткі камбінату) і інжынэр Сальмановіч—загадчыкам электрычнай станцыі і кіраўніком будаўнічай часткі камбінату. Здавалася, што склад праўленьня павінен быць працаздольным.

Распачалася праца. Горад Барысаў, пацярпеўшы ад бязпаляпкаў, пачаў будавацца. Будаўніцтва разбураных установаў, школ, больніц, лазьняў, мастоў і інш. патрабавала ня толькі значных сродкаў будаўнічых матар'ялаў, але і добрага гаспадарчага вока і ведаў.

Калі пасыпаліся заявы на пэглу, акруговы выканаўчы камітэт даручыў камбінату пабудаваць пагельны завод, на што і адпусьціў 35000 р.

Інжынэр Сальмановіч склаў праэкт на пабудову заводу; камбінат камандыраваў у вёску Студзёнку на будаўніцтва тэхніка Ходаса.

Закіпела работа. Праз тыдзень-другі на полі пад адкрытым небам паявіліся вялікія печы, але хутка пашлі дажджы, печы разьмяклі і разваліліся. Пабудаваць-жа над печамі навесі камбінатчыкі забыліся, і некалькі тысяч руб. прышлося выкінуць на вецер.

Тым часам у Барысаве зьявіўся прыватны гандляр з Магілева—Брук. Гандлёвыя справы Брука не давалі яму прыбытку. Пазнаёміўшыся з Біргерам і Шліонскім, Брук зрабіў дастаўмыкам скур на скураны завод камбінату. Біргер і Шліонскі так упадабалі Брука і так яму даверыліся, што сталі выдаваць яму значныя авансы; урэшце, Брук, чаго і трэба было чакаць, прысвоіў каля 5000 руб. і зьнік. Біргер пусьціўся шукаць Брука: была вышлена спэцыяльная камандыроўка. Доўга Біргер вандраваў па Беларусі, але вынікі былі надта кепскія: Брука Біргер не знайшоў, а 2-хпавярховы дом Брука ў Магілеве аказаўся ўласнасьцю яго далёкіх сваякоў.

На каманды